Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 СТУДЗЕНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 7 (26120)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

МАЯ СЯМ'Я: АД ДАПАМОГІ ДА ЖЫЛЛЯ

Памеры штомесячных дзіцячых дапамог і аднаразовых дапамог пры нараджэнні, магчымасць атрымання дапамог на дзіця ва ўзросце больш за 3 гады і бясплатнага харчавання на немаўлят, падатковыя вылікі шматдзетным сем'ям і сем'ям з дзецьмі-інвалідамі, працоўныя гарантыі сем'ям, дапамога ў пагашэнні як ільготных, так і няльготных крэдытаў на жыллё, а таксама іншыя пытанні — усё гэта стане тэмай чарговай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Васільеўны ШЭМЕТАВЕЦ** і **галоўнага спецыяліста ўпраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры Марыяны Мікалаеўны ЕЎТУШЭНКАВАЙ.**

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! Наша «прамая лінія» адбудзецца з 11 да 12 гадзін 17 студзеня па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«КЛЮЧАВЫМ У РЭАЛІЗАЦЫІ ПЯЦІГАДОВАЙ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ СТАНЕ 2008 ГОД»

Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод.

Дзяржаўных узнагарод, падзяк Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і прысвоення ганаровых званняў былі ўдастоены 65 чалавек.

«Прыемна пачынаць новы год з віншавання лепшых людзей краіны», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт даў высокую ацэнку заслугам кіраўнікоў і супрацоўнікаў прамысловых прадпрыемстваў, якія ў складаных умовах здолелі не толькі не знізіць тэмпаў вытворчасці, але і значна іх нарасціць, дабіўшыся пры гэтым павышэння эфектыўнасці гаспадарання. У прыватнасці, калектыў ЗАТ «Атлант» у сціслыя тэрміны асвоіў выпуск новых відаў прадукцыі і ўнёс важкі ўклад у рэалізацыю дзяржпраграмы імпартазамяшчэння.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, глыбокай павагі і пахвалы заслугоўваюць супрацоўнікі праваахоўных органаў і пагранічнікі. «Дзякуючы іх мужнасці і прафесіяналізму спынена злачынная дзейнасць тых, хто парушае законы, замахваецца на жыццё і маёмасць нашых грамадзян», — адзначыў Прэзідэнт. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў гэтым годзе ў Беларусі па-ранейшаму неаслабная ўвага дзяржавы будзе ўдзяляцца забеспячэнню правапарадку і барацьбе з любымі відамі злачыннасці.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што сярод узнагароджаных — шмат вучоных і педагогаў, дзеячаў мастацтва, прадстаўнікоў СМІ. «Мы падкрэсліваем важнасць умелай і мэтанакіраванай выхаваўчай работы, паслядоўнай і актыўнай пазіцыі ў прапагандзе культурных і маральных каштоўнасцяў, кансалідацыі грамадства дзеля ўмацавання і працвітання нашай маладой дзяржавы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

За вялікі асабісты ўклад у развіццё і ўмацаванне эканамічнага супрацоўніцтва і дружалюбных адносінаў паміж Беларуссю і Туркменістанам ордэнам Дружбы народаў узнагароджаны былы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Туркменістана ў Рэспубліцы Беларусь Ілля Вельджанаў. Ордэна Айчыны трэцяй ступені ўдастоены генеральны дырэктар Беларускага оптыка-механічнага аб'яднання «БелОМА» Вячаслаў Бурскі. Ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі.

Сярод узнагароджаных — галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Палаца Рэспублікі Віктар Бабарыкін, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Раіса Баравікова, рэктар Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Валерый Башметаў і многія іншыя.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МЗС пазітыўна ацэньвае дынаміку адносінаў паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам за 2007 год

Аб гэтым заявіў прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.

«Мы з задавальненнем канстатуем, што мінулы год быў азнаменаваны правядзеннем цэлага шэрагу значных сумесных мерапрыемстваў з Еўрапейскім саюзам і яго дзяржавамі-членамі», — сказаў Андрэй Папоў. Адбыўся абмен візітамі афіцыйных асобаў Еўрапейскага саюза і Беларусі, у тым ліку на ўзроўні ўрада Рэспублікі Беларусь і кіраўніцтва Міністэрства замежных спраў, праведзены кансультацыі і перагаворы па розных напрамках двухбаковага і шматбаковага супрацоўніцтва, адбыліся сумесныя семінары і канферэнцыі па тэмах агульнага інтарэсу.

«Гэтыя сумесныя крокі, на наш погляд, адкрываюць магчымасці для вываду нашых адносінаў з ЕС на новы ў параўнанні з папярэднім перыядам узровень, які дазволіць развіваць далейшае ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і ЕС на прагматычнай, узаемавыгаднай аснове», — падкрэсліў прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства.

«Мы спадзяёмся, што адкрыццё ў Мінску прадстаўніцтва Еўракамісіі створыць аснову для далейшай актывізацыі і пашырэння нашых адносінаў з Еўрапейскім саюзам па такіх узаемавыгадных напрамках, як энергетыка і энергаэфектыўнасць, транспарт і транзіт, прыродаахоўная дзейнасць, узаемадзеянне мытных і пагранічных службаў, навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва і іншых», — сказаў Андрэй Папоў.

Семежаўскія «Цары»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

"Цары" – жывая калядная традыцыя ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна. Гэта адзінае месца ў Беларусі, дзе існаваў і захаваўся гэты абрад.

Працягвае працаваць кожны пяты пенсіянер

На 1 студзеня ў Беларусі налічвалася 2 млн 444,3 тыс. пенсіянераў, сярод якіх 893,3 тыс. пражываюць у сельскай мясцовасці, а астатнія — у гарадах.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва, працягвала працаваць 544,3 тыс. пенсіянераў, або 22,3 працэнта ад іх агульнай колькасці, прычым у пачатку мінулага года гэты паказчык быў меншым — 21,5 працэнта. Абсалютная большасць працуючых пенсіянераў мае ўзрост, блізкі да выхаду на пенсію. Разам з тым у краіне працягвае працаваць 23,6 тыс. мужчын і 20,4 тыс. жанчын, якія ўжо дасягнулі 70 і больш гадоў.

Сяргей ГРЫБ.

3-я і 4-я лініі метро

ААТ «Мінскметрапраект» у 2008 годзе пачне падрыхтоўку перадпраектнай дакументацыі на будаўніцтва 3-й лініі Мінскага метрапалітэна, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА галоўны інжынер гэтай арганізацыі Віктар Палішчук.

Трэцяя лінія будзе складацца з 14 станцый агульнай працягласцю 17,2 км. Яна злучыць паўднёвыя і паўночныя жылыя масівы горада з цэнтрам. У прыватнасці, лінія пройдзе з Зялёнага Луга да Курасоўшчыны. Яе шлях праляжа па вуліцах Багдановіча, праспекце Машэрава, праспекце Пераможцаў, вуліцах Мельнікайтэ, Клары Цэткін, каля чыгуначнага вакзала, па вуліцах Аэрадромнай, Каржанеўскага. Трэцяя лінія перасячэ дзве існуючыя: на першую лінію перасадка будзе ажыццяўляцца на станцыі «Плошча Леніна», на другую — на «Фрунзенскай». Да 2017 года намечана ўвесці ў эксплуатацыю ўчастак з пяццю станцыямі — ад «Юбілейнай (у раёне вуліцы Мельнікайтэ) да «Аэрадромнай» (каля будучага дзелавога цэнтра «Мінск-Сіці») даўжынёй 5,5 км. Да 2019 года — участак ад «Юбілейнай» да «Вуліца Максіма Багдановіча» (3 станцыі, 3,3 км), а да 2024 года — ад «Аэрадромнай» да станцыі «Курасоўшчына» (з электрадэпо і 2 станцыямі працягласцю 2,8 км). Цяпер вядзецца будаўніцтва трох станцый першай лініі ад «Інстытута культуры» да станцыі «Пятроўшчыка» ў бок Паўднёвага Захаду агульнай працягласцю 5,5 км. Увесці ў эксплуатацыю гэты ўчастак запланавана да 2011 года. У больш аддаленай перспектыве — пракладка 4-й лініі метро. Яна паўкольцам пройдзе па паўночнай частцы Мінска праз прамысловую зону ўздоўж вуліцы Даўгабродскай да мікраёна Чыжоўка. У даўжыню гэты маршрут зойме 18,8 км і будзе налічваць 13 станцый.

Цяпер эксплуатацыйная даўжыня ліній Мінскага метрапалітэна ў двухпутным вылічэнні складае 30,3 км з 25 станцыямі і перасадачным вузлом. Рухомы састаў метрапалітэна налічвае 243 вагоны.

МАГІЛЁЎШЧЫНА СВЯТКУЕ ЮБІЛЕЙ

«Светлая будучыня» Разанцаў

12 студзеня на ўрачыстым сходзе, прысвечаным юбілею Магілёўскай вобласці, Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўручыў Магілёўскай вобласці Ганаровы сцяг — у сувязі з 70-годдзем утварэння і за асаблівыя дасягненні гаспадарчага развіцця.

Кіраўнік урада зачытаў пасланне Прэзідэнта Беларусі і павіншаваў удзельнікаў сходу з юбілеем.

Прэм'ер-міністр таксама ўручыў сямі заслужаным працаўнікам вобласці Ганаровыя граматы Савета Міністраў Беларусі.

На сходзе 15 працаўнікоў атрымалі за значныя вынікі ў прафесійнай і грамадскай дзейнасці па выніках 2007 года спецыяльную прэмію аблвыканкама «Чалавек года».

Сярод узнагароджаных — Пётр Лаўнікаў, старшыня СВК «Кастрычнік» Мсціслаўскага раёна. Гэта гаспадарка за няпоўнае дзесяцігоддзе зрабіла значны рывок: са слабай і адсталай стала перадавой у раёне і трапіла ў лік паўсотні лепшых у краіне.

Працаўнікамі калгаса «Кастрычнік» сталі перасяленцы з пацярпелага ад чарнобыльскай радыяцыі Чэрыкаўскага раёна. У чыстым полі на памежжы з Расіяй пабудавалі пасёлак Разанцы, і новую гаспадарку перасяленцы назвалі ў памяць свайго калгаса на Чэрыкаўшчыне. А цяпер Лаўнікаў і яго людзі лічаць назву «Кастрычнік», няхай і савецкую, сваім талісманам, які прыносіць удачу.

Сёння цяжка паверыць, што яшчэ восем гадоў таму з калгаса беглі спецыялісты, людзям затрымлівалі заробак. І калі Пётр Лаўнікаў узначаліў гаспадарку, там даілі 1400 кілаграмаў малака ад каровы і атрымлівалі збожжа 16 цэнтнераў з гектара.

— Гэта было амаль нічога, — узгадвае старшыня. — А за кошт чаго выкараскаліся? Проста працавалі. Я па спецыяльнасці аграном і зямлю люблю. Сталі займацца тэхналогіяй, набылі па крэдытах тэхніку, шукалі маладых і разумных спецыялістаў, пераконвалі рабочых імкнуцца працаваць лепш. Улада спрыяла. І паступова сталі расці і бачыць вынікі. Летась ураджайнасць збожжавых у амбарнай вазе склала 50 цэнтнераў з гектара, надой ад каровы — амаль 5400 кілаграмаў.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АЛІЕЎ І ЮШЧАНКА НЕ ПАЕДУЦЬ НА ІНАЎГУРАЦЫЮ СААКАШВІЛІ

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў адмовіўся ад запрашэння прыехаць на цырымонію інаўгурацыі свайго грузінскага калегі Міхаіла Саакашвілі.

Прычыны адмовы прэс-служба кіраўніка азербайджанскай дзяржавы не ўдакладняе. Між тым Аліеў быў адным з першых, хто павіншаваў Саакашвілі з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах, не дачакаўшыся нават абнародавання афіцыйных вынікаў галасавання. Раней ад запрашэння прыбыць на інаўгурацыю адмовіўся прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка. Украінскую дэлегацыю, якая накіруецца ў Тбілісі, узначаліць прэм'ер Юлія Цімашэнка.

«АЛЬ-КАІДА» РЫХТУЕ ТЭРАКТЫ Ў ПАРЫЖЫ?

Брытанскі таблоід The Sun сцвярджае, што тэрарысты з «Аль-Каіды» рыхтуюць да 10 выбухаў у Парыжы, накіраваных супраць турыстаў. Паводле інфармацыі газеты, выбухі мяркуецца ажыццявіць з дапамогай смяротнікаў.

Згодна з атрыманай выданнем інфармацыяй, аб'ектамі магчымай атакі з'яўляюцца Эйфелева вежа, Дыснэйлэнд, знакамітая парыжская вуліца Елісейскія палі, а таксама два міжнародныя аэрапорты.

МАДОНУ ПАДАЗРАЮЦЬ У ПАДМАНЕ ААН І GUCCI

Вядомая амерыканская спявачка Мадона падазраецца ў падмане Дзіцячага фонду ААН і дома мод Gucci, пад эгідай якіх поп-дзіва праводзіла дабрачынную кампанію па зборы сродкаў у дапамогу афрыканскім дзецям.

Год таму Мадона ўсынавіла маленькага афрыканца з Малаві і з таго часу не аднойчы выказвала заклапочанасць становішчам дзяцей у гэтай краіне. Спявачка нават стварыла дабрачынны фонд на карысць развіцця Малаві. Да дабрачыннай акцыі на карысць афрыканскіх дзяцей таксама былі прыцягнуты зорка тэлесерыяла «Сэкс у вялікім горадзе» Сара Джэсіка Паркер і адна з самых сэксуальных актрыс Галівуда Сальма Хайек.

Аднак, як паказала журналісцкае расследаванне Fox News, ахвяраванні, сабраныя на дабрачынным вечары кампаніі Gucci на карысць фондаў Raising Malawi і UNICEF, аселі на рахунках Цэнтра Кабалы Філіпа Берга, якога Мадона лічыць сваім духоўным настаўнікам. Прэс-служба спявачкі абвяргае гэту інфармацыю.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08007

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 199,41
1 латвійскі лат	4 575,44
1 літоўскі літ	925,97
1 чэшская крона	123,58
1 польскі злоты	893,88
1 расійскі рубель	88,51
1 украінская грыўня	426,33

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,2913
10 UAH	47,6880
1000 BYR	11,2610
EUR	36,1212

Курс у гандлёвых кампаніях (на 14.01.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209 69 01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

СОНЕЧНАЕ НАДВОР'Е ХУТКА ЗМЕНІЦЦА НА МОКРЫ СНЕГ І ДОЖДЖ

У першай палове тыдня надвор'е ў краіне будзе вызначаць перыферыя антыцыклону з цэнтрам над Ніжняй Волгай, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідрапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў. Таму да чацвярга ў нас будзе пераважна без ападкаў. Раніцай і ўначы туман, слабы галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 0 да 5 цяпла.

У чацвер надвор'е сапсуецца. У гэты дзень у заходнім рэгіёне, а ў пятніцу, суботу і нядзелю па ўсёй тэрыторыі краіны чакаецца мокры снег і дождж, месцамі туман і галалёд. Тэмпература паветра ў пятніцу на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У нядзелю ўначы — ад 5 марозу да 2 цяпла, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

Такі тэмпературны рэжым прыкладна на 6—8 градусаў вышэй за норму і адпавядае няўстойлівай цеплыні ў сакавіку.

Сяргей КУРКАЧ.

ДЗЯЎЧЫНА, ЗАГЛЯДЗЕЎШЫСЯ НА АВАРЫЮ, САМА ТРАПІЛА Ў ДТЗ

Як паведаміў «Звяздзе» прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, ДТЗ зафіксавана ў Жыткавіцкім раёне на трасе Мінск — Мікашэвічы. Паблізу вёскі Беразнякі вадзіцель «Опеля» не справіўся з кіраваннем і з'ехаў у кювет, дзе машына ўрэзалася ў дрэва. У выніку аварыі 32-гадовы мужчына загінуў на месцы, а яго 26 гадовы сябар быў заціснуты ў кузаве аўтамабіля. У кювеце побач апынулася і машына, якой кіравала дзяўчына, якая адарвала ўвагу ад дарогі. Ёй пашанцавала больш, таму што медыцынскай дапамогі ёй не спатрэбілася. Што ж датычыцца пацярпелага пасажыра «Опеля», які быў заціснуты ў аўто, то яго выратавальнікі выцягнулі з машыны пры дапамозе спецыяльнага абсталявання, пасля чаго мужчына быў дастаўлены ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

ДТЗ ВЫКЛІКАЛА ЛІСА

У канцы мінулага года на Гродзеншчыне жывёлы неаднаразова правакавалі дарожныя здарэнні з цяжкімі наступствамі.

Позна вечарам 11 студзеня на 110-ым кіламетры аўтадарогі Слонім — Масты — мяжа Літвы аўтаварыю выклікала з'яўленне на праезнай частцы... лісы. Ля горада Скідаль Гродзенскага раёна вадзіцель «Пежо» страціў кіраванне, з'ехаў у правы кювет. Аўтамабіль перакуліўся і прыціснуў юнака, які сядзеў ззаду. Ён дажыў да прыезду брыгады хуткай дапамогі, але атрыманыя траўмы аказаліся несумяшчальнымі з жыццём. Да свайго паўналецця хлопец не дажыў каля дзесяці месяцаў. Вадзіцель, які ўсяго паўгода таму атрымаў вадзіцельскае пасведчанне, і яшчэ двое пасажыраў аўтамабіля не пацярпелі.

Мікалай КАРАБАН,
начальнік УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

ІНСПЕКТАР-ХАБАРНІК

Да шасці з паловай гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці асуджаны старшы інспектар Гродзенскай рэгіянальнай мытні.

Паводле звестак прэс-цэнтра Генеральнай пракуратуры краіны, мытнік на працягу 2005—2006 гадоў без належнага афармлення прапускаў транспартныя сродкі з грузамі. За падобныя паслугі, як устанавіла следства, ён атрымаў хабар агульным памерам 1270 долараў і тавараў на 400 тысяч рублёў.

«СУВЕНІРЫ» ДАВЯЛІ ДА СУДА

Дорага давядзецца заплаціць сталічнаму жыхару М. за пяць патронаў, якія ён знайшоў у лесе.

Паводле звестак прэс-групы ўпраўлення ваеннай контрразведкі КДБ краіны, уладальніка небяспечных «сувеніраў» чэкісты вывелі на чыстую ваду пры дапамозе яго суседа, якога злавілі падчас продажу пісталета «Вальтэр» і абрэза вінтоўкі Мосіна. Гандляр зброяй «шчыра» прызнаўся, што дзейнічаў не адзін, а ў звязку з суседам. Супрацоўнікі спецслужбаў і сапраўды знайшлі ў кватэры спадара М. пяць патронаў. Але, як высветлілася пазней, сусед яго проста «агаварыў». Сам уладальнік патронаў паведаміў, што знайшоў іх у лесе і пакінуў у якасці «сувеніраў». Вось за гэтыя «сувеніры» суд прыгаварыў іх уладальніка да 1 года папраўчых работ (так званай «хіміі») з утрыманнем у даход дзяржавы 20 працэнтаў заробку. А гандляру зброяй прызначана пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на два гады.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Спецыяльна для «Звязды»

ТЭРЫТОРЫЯ, НЕСПРЫЯЛЬНАЯ ДЛЯ КАРУПЦЫЯНЕРАЎ

У Мінскай вобласці да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 176 карупцыянераў рознага рангу

Змагацца са злачыннасцю ўвогуле і з такой яе праявай, як карупцыя, праваахоўнікам цэнтральнага рэгіёна заўсёды больш складана, чым калегам з глыбінкі. Мінская вобласць — самая вялікая ў краіне. Менавіта тут сканцэнтраваны агромністыя фінансава-эканамічныя рэсурсы Беларусі. А блізкасць да сталіцы, якая вабіць шукальнікаў прыгод і лёгкіх грошай з усёй краіны і нават блізкага замежжа, сама па сабе аказвае негатыўны ўплыў на крымінагенную сітуацыю ў вобласці. Аднак нягледзячы на гэтыя аб'ектыўныя цяжкасці летась колькасць злачынстваў з прыкметамі карупцыі на Міншчыне зменшылася.

Аб тым, як сталічны рэгіён пераўтварыўся ў тэрыторыю, неспрыяльную для карупцыянераў, аглядальніку «Звязды» распавядае прокурор Мінскай вобласці, Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь Міхаіл СНЯГІР.

— Міхаіл Валянцінавіч, якім чынам удалося зменшыць узровень карупцыі на Міншчыне?

— Хачу адразу падкрэсліць, што барацьба з карупцыяй у вобласці, як і па ўсёй краіне, вядзецца мэтанакіравана і сістэмна. Тэндэнцыі па змяншэнні колькасці адмысловых злачынстваў сталі заканамерным вынікам дзяржаўнай палітыкі. Агульнавядома, што вялікую ўвагу гэтай праблеме надае Прэзідэнт. Зараз рэалізуецца зацверджаная кіраўніком краіны чарговая Дзяржаўная праграма па ўзмацненні барацьбы з карупцыяй. Увогуле, у Беларусі створана неблагая заканадаўчая база для прафілактыкі і процідзеяння гэтым небяспечным злачынствам. Словам, зусім заканамерна, што Міншчына, як і ўся Беларусь, дасягнула ў барацьбе з карупцыяй пэўных поспехаў. Напрыклад, летась у вобласці было зарэгістравана 416 злачынстваў карупцыйнага кшталту, што на 15 фактаў менш, чым у 2006 годзе. У прыватнасці, колькасць выпадкаў хабарніцтва скарацілася са 132 да 122, крадзяжоў шляхам злоўжывання службовым становішчам — са 134 да 97. Да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 176 карупцыянераў рознага рангу. Найбольш паспяхова барацьба з карупцыяй вялася ў Барысаўскім, Салігорскім і Слуцкім раёнах.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
проводит открытый аукцион по продаже обращенных в доход государства:

Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток
Незавершенное строительством капитальное строение, (пристройка к корпусу № 17 «а»)	1598,4	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67.	643 647 060	10 %
Здание цеха № 2 по выпуску кирпича, шихтозапасник, туннельная печь «Модуль 70», туннельная сушилка	21182,3	Молодечненский район, г.п. Радошковичи, ОАО «Радашковичский керамический завод»	3 345 114 267	50 000 000
Административно-бытовая пристройка	3898,3	г. Молодечно, ул. Замковая, 19	764 424 900	5 %
Корпус административно-бытовой и производственный	2780,6	г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 56	1 732 674 210	50 000 000
Здание подстанции	55,8	г. Молодечно, ул. Волынца, 12	18 183 200	10 %
Здание проходной	22,6	г. Молодечно, ул. Волынца, 12	6 151 910	10 %
Прессовый участок пластмасс (пристройка к корпусу № 16 Б)	199,1	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	52 704 440	10 %
Пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б	422,1	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	87 143 410	10 %
Пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б	298,2	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	80 579 322	10 %
Корпус 15, кузница и цех пластмасс, венткамера корпуса № 15	396,6 66,9	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	74 816 945	10 %

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **19 февраля 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **18 февраля 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Прамая лінія «Звязды»

ЯК НАБЫЦЬ ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ ПАВОДЛЕ НОВЫХ ПРАВІЛАЎ

На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Андрэй ГАЕЎ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 9—12 студзеня.)

☎ — Як атрымаць зямельны ўчастак у Хацежынскім сельскім Савеце? Звярталіся туды, але нам адмовілі, бо, кажуць, увогуле ў чаргу на атрыманне зямельнага ўчастка не ставяць. Што рабіць?

Ніна САМОЙЛАВА,
в. Старое Сяло, Мінскі раён.

— Зараз выканкамы абавязаны будуць прадастаўляць інфармацыю для грамадзян аб наяўнасці зямельных участкаў на стэндах у службовых памяшканнях і праз кампʼютарную сетку. Вам неабходна падаць заяву ў выканкам. Беспадстаўна адмовіць вам у выдзяленні зямельнага ўчастка цяпер ужо не могуць. Толькі ў выпадку, калі зямельных участкаў і сапраўды няма ў наяўнасці, тады яго і нельга набыць.

— Людзі кажуць, што ўчасткі ёсць, але іх не ўсім даюць. Даюць тым, хто... вы разумееце?

— Калі вы дакладна ўпэўнены, што вам адмовілі беспадстаўна, то можаце звярнуцца ў землеўпарадкавальную службу раёна, або ў Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі, каб спецыялісты праверылі такія факты.

☎ — У мяне двое дзетак жывуць у Мінску. Сама жыву ў Пінскім раёне адна без свякоў. Ці магчыма мне па новаму ўказу набыць участак зямлі пад Мінскам і перавезці туды свой дом?

Надзея Л., *Брэсцкая вобласць.*

— Зямельны ўчастак каля Мінска, у вашым выпадку, магчыма набыць толькі праз аўкцыён. У іншым выпадку можна купіць ужо жылы дом, а потым і аформіць з ім зямельны ўчастак.

— У мяне няма для гэтага такіх вялікіх грошай. А магчыма атрымаць зямельны ўчастак на льготных умовах?

— Не. Толькі ў выпадку, калі вы адшукаеце чалавека ў Мінскім раёне, які пажадае ажыццявіць абмен на ваш дом з зямельным участкам у Пінскім раёне.

— Знайсці такога кліента будзе цяжка. А колькі грошай трэба, каб набыць зямельны ўчастак каля Мінска?

— У залежнасці ад адлегласці ад сталіцы і інфраструктуры месца, невялікі ўчастак можа каштаваць да некалькі дзесяткаў тысяч долараў.

☎ — Маю ў арэндзе зямельны ўчастак плошчай 50 квадратных метраў, дзе знаходзіцца мая цырульня. Мною плаціцца арэнда зямлі, падатак на нерухомасць, выконваліся работы па ўпарадкаванні тэрыторыі, якая прылягае да павільёна. Паводле рашэння мясцовых уладаў, летась ажыццяўляла рэканструкцыю фасада павільёна. Тэрмін арэнды на гэты ўчастак зямлі заканчваецца ў 2012 годзе. Ці маю я права разлічваць на прадаўжэнне тэрміну арэнды без аўкцыёну?

Індывідуальны прадпрымальнік Юлія ШПАКОЎСКАЯ,
г. Марʼіна Горка.

— Прадаўжэнне тэрміну арэнды можа ажыццяўляцца без правядзення аўкцыёну. Гэта не новае прадастаўленне зямельнага ўчастка, а толькі прадаўжэнне тэрміну фактычнага выкарыстання зямельнага ўчастка. Калі вам трэба мець афіцыйны адказ з боку дзяржаўных органаў, то вы можаце звярнуцца з пытаннем у наш камітэт. Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь знаходзіцца па адрасе: зав. Чырваназорны, 12, 220005, г. Мінск.

Сяргей КУРКАЧ.
(Працяг будзе.)

В извещении о проведении открытого аукциона

по продаже зданий ОАО «Автомагистраль» расположенных в г. Гродно, ст. Аульс, опубликованном в газете «Звязда» от 29.12.2007 г., предложение «Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона» дополнить предложением следующего содержания: «Оплата за объект осуществляется в течение 10 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи».

Тел: 224 61 34.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Кватэрнае пытанне

Калі падставы былі... зніклі... з'явіліся

Мы з дзвюма дочкамі ўсё жыццё пражылі ў двухпакаёўцы плошчай 39 кв. метраў, з 1987 года стаялі ў чарзе на пашырэнне. Але потым дочкі павыходзілі замуж, павыпісваліся. А вось прапісалася да нас у 2004 годзе толькі матуля-інвалід. З таго ж года мы зноў у спісах на жыллё. Ці законна з намі абышліся? Ці маглі пакінуць у чарзе з нашага, 1987-га года?

Л. Н. *г. Бяроза*

У пісьме не ўказаны матывы пераносу чарговасці. Верагодна, прымаючы такое рашэнне, выканкам расцаніў як пагаршэнне жыллёвых умоў змяненне парадку карыстання жылым памяшканнем, у якім забяспечанасць агульнай плошчай перавышала 15 кв. метраў на аднаго чалавека (пасля выбыцця і выпіскі дачок з кватэры). У гэтым выпадку, паводле заканадаўства, грамадзяне не прымаюцца на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

У далейшым, пасля ўсялення ў кватэру ў 2004 годзе на законных падставах непрацаздольнай маці, забяспечанасць агульнай плошчай стала менш за 15 кв. метраў на аднаго чалавека, што і з'явілася падставай для пераносу чарговасці.

Рашэнне аб яе змяненні прымаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, адміністрацыяй іншага дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі сумесна з прафсаюзным камітэтам, які прыняў грамадзян на ўлік. У рашэнні ўказваюцца падставы для змянення чарговасці і тэрмін, на які яна пераносіцца, аб гэтым паведамляецца грамадзяніну ў пісьмовай форме ў 10-дзённы тэрмін.

У выпадку нязгоды, рашэнне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа аб змяненні чарговасці можна абскардзіць у судовым парадку.

Віктар САВІЦКІ.

СПЛАНАВАНАЯ СТАРАСЦЬ

Спрэчныя нататкі

Кожная маладая істота павінна пакінуць гняздо, нару, логава і г.д., дзе вырасла, і падацца ў невядомы свет і там пачаць сваё жыццё, даць патомства. Гэтаму непахіснаму закону Прыроды падпарадкоўваецца ўсё жывое на Зямлі. І людзі прытрымліваюцца гэтай установкі — дзеці выраслі і пакінулі бацькоўскі дом. Але ідзе старасць, а за ёю — нямогласць, і чалавек пачынае планаваць.

У гэтым артыкуле я па этычных меркаваннях прозвішчаў называць не буду, хоць тут ніякіх сакрэтаў няма.

Некалькі гадоў таму давялося напісаць пра старога з Нясвіжскага раёна («І зноў зацвіце сад»). Дзед жыў на ўскраіне вёскі, амаль як на хутары. Хата новая, з «венскімі» вокнамі, ды сад вялікі. У старога было трое ўнукаў і ўнучка — ад дачкі і сына. Здавалася, што дзед паступіў вельмі мудра, калі ўсю гаспадарку адпісаў на ўнука, які закончыў сельгасакадэмію. І мала хто сумняваўся, што пры маладым гаспадары-аграноме дзедаў сад будзе і далей квітнець. Але ўнука цягнула не да зямлі, а да гарэлкі.

Калі стары злёг, то яго не кінулі і ўнук зазіраў у хату.

— Што ты, дзед, ляжыш, як у разоры, давай прыпадыму цябе, — кажа ўнук, а сам з-пад падушкі не ды адшчыпне ад дзедавай пенсіі частку грошай. Дзед пенсію пералічыць — і ўжо бядуе, і брэша на ўнука.

Неўзабаве дзеда пахавалі, а ўнук піў, піў ды пайшоў у дзедаў хлеў і павесіўся. У хуткім часе памёр і сын старога.

Сёння там, дзе была тая сядзіба, гуляе вецер, бо хату купіў чалавек і перавёз у другую вёску, а сад пайшоў на дровы.

Такога фіналу стары і ў страшным сне не мог убачыць. Хоць мала быць і інакш. Каб усё ішло натуральна, без планаў і мараў, то нехта з унукаў тую хату ўзяў бы пад дачу, ва ўсякім разе, пра такі варыянт мне з жалем гаварылі сваякі. Вельмі ж ужо прывабнае месца было.

Калі наступае старасць, людзі пачынаюць хвалявацца і кожны шукае выйсце ў адпаведнасці са сваім розумам, характарам і прывязанасцю.

Добра знаёмая, якой толькі пераваліла за 60 гадоў, напісала завяшчанне. Сваю трохпакаёвую кватэру перадае жонцы святара, якая жыве за 50 кіламетраў ад Баранавіч. А чаму не царкве, пры якой ёсць савет і можна было б абгаварыць умовы завяшчання?

— Матушку так паважаюць. Калі прыйдзе ў царкву, то дзеткі ёй рукі цалуюць, — патлумачыла жанчына.

— Міхайлаўна, няўжо, калі ты зляжаш, яна будзе цябе даглядаць?

— А яна сказала, што не кіне, — глядзіць наіўна пенсіянерка.

Жанчына адзінокая, і яе палохае будучыня. Але ў нас добра пастаўлена сацыяльная служба і ёсць факты, калі там знаходзілі надзейнага чалавека — сталую жанчыну, якая і даглядала нямоглага да самай смерці, але кватэра нябожчыка ўжо заставалася ёй. І гэта нармальны варыянт. У старога чалавека ёсць гарантыя, бо падключана дзяржаўная структура і ўсё афармлена юрыдычна. Чаго яшчэ хацець? Кватэру ўсё роўна на той свет не забярэш і не трэба думаць пра нейкага там пляменніка, які да цёткі ні разу не зазірнуў.

Нагадаю факт, які давялося ўбачыць у Леснянскім доме-інтэрнаце для састарэлых. Жыхар Брэста захварэў — адняліся ногі. Жонка з дачкой пачалі выжываць інваліда з кватэры — адпраўляць у Дом састарэлых. І ён пайшоў, але перад гэтым прадаў свой пакой, а грошы перадаў Леснянскаму дому-інтэрнату. За гэта чалавеку далі асобны пакойчык, у якім стаіць тэлевізар, на сцяне вісіць дыван. Інваліду прыносяць паесці, абмываюць, вывозяць на прагулку, заходзіць праведаць доктар, медсястра пастаянна зазірае. Жыццё ў сям'і мужчына ўспамінаў як кашмар.

Чалавеку найбольшы сваяк той, хто дапамог і падтрымаў, хто цябе разумее і каго разумееш ты. Калі сын забівае бацьку ці наадварот, то пра якую роднасць можна гаварыць. А такіх фактаў нямала.

Вось чаму, каб жыць спакойна, то не трэба, на маю думку, трымаць дзяцей пры сабе, нават калі яны ўдалыя — дзве сям'і ў адным доме, а тым больш кватэры — гэта пастаянная пагроза канфліктаў. І падстаў для іх шмат. Маладыя жывуць сваімі інтарэсамі, у іх часта іншыя жыццёвыя каштоўнасці, розныя характары... Але старасць аргументаў маладосці не прызнае.

Калі нехта з бацькоў застаецца адзін, то ў хаце з'яўляецца сын, радзей дачка, бо калі ў яе ёсць дзеці, яна ўжо прывязаная да іх. Прыходзіць сын, у якога сваё жыццё не склалася і па вельмі вядомай прычыне — любіць выпіць. Грошай сваіх не мае, бо сёння выпівоху ніхто на рабоце трымаць не будзе, і «вісне» на бацькавай шыі, дакладней пенсіі. Добра, калі яшчэ трымае нейкую жывёліну, то тады можна пачуць: «Я на гаспадарцы». Вядома, карова ці свіння з голаду памерці не дадуць, але не болей за тое. Закуска ёсць, няхай і часова, а на гарэлку «выбіваецца» пенсія. І часта ў прамым сэнсе гэтага слова.

Безумоўна, бацька ці маці маглі б сына ў хату і не пусціць. Ёсць сям'я, дзеці, кватэра, то ідзі і жыві там, разбірайся сам са сваімі праблемамі. Але ж сваё дзіця, як правіла, не вінаватае. «Вось каб была ў яго добрая жонка, то і толк быў бы», — апраўдвае сына бацька.

Прыкладаў, калі на старасці на бацьках «вісне» адно з дзяцей, процьма, і жыцця спакойнага ў той хаце няма.

Дык навошта нешта дзяліць, пакуль жывыя? Пасля смерці дзеці ва ўсім разбяруцца. Не здолеюць самі — суд дапаможа. Вы ж ад гэтай мітусні будзеце далёка-далёка. А то даходзіць да абсурду.

Адна старая перад смерцю спрабавала нават падзяліць грошы, якія дзяржава выдзяляе на пахаванне, хоць тыя 700 тысяч рублёў даюцца не нябожчыку, а яго родным.

Добра, калі чалавек распланаваў ды ў хуткім часе памёр і не ведае, што пасля яго робіцца. А то падорыць дом сыну, а смерць не прыходзіць год, другі... і бачыць стары, што яму ўжо няма месца ў родным доме, бо там гаспадар ўжо другі. І кідаецца чалавек у розныя інстанцыі, каб дом вярнуць назад — перапісаць на дачку, а ўжо позна.

Дык чаго спяшацца планаваць, дарыць і... паміраць — жыццё ўсё паставіць на месца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 41 71

Каб выплаціць кампенсацыю за пуцёўку, патрэбна адпаведнае рашэнне

Людміла Мікалаеўна Дрозд з вёскі Леткаўшчына Слуцкага раёна ўжо звярталася па дапамогу ў «Звязду». «Было гэта гадоў з пяць таму. Вы тады сапраўды вельмі дапамаглі майму мужу, дзякуй яшчэ раз. Тую газету захоўваю дагэтуль. Магчыма, і зараз нейкім чынам паспрыяеце, здолееце дапамагчы разабрацца ў нашай сітуацыі».

Справа ў тым, што сям'я выхоўвае дзіця-інваліда (з дзяцінства) да 18 гадоў (дарэчы, у вёсцы ёсць яшчэ адна такая ж сям'я). «Раз у год нам ад райсабеса павінны даваць пуцёўку на санаторна-курортнае лячэнне. У 2007 годзе, колькі мы не прасілі, атрымаць пуцёўку не атрымалася. Таму нам належала атрымаць за яе кампенсацыю. Дакументы ўсе былі падрыхтаваны, заставалася толькі чакаць: звычайна кампенсацыю за нявыкарыстаную на працягу года пуцёўку выплачвалі ў пачатку наступнага. Але нядаўна мы даведаліся, што быццам бы такой выплаты за 2007 год не будзе. Чаму? Мы ведаем, што, згодна з адмененымі з 17 снежня 2007 года некаторымі льготамі, у 2008 годзе, калі не атрымаў пуцёўку, дык і кампенсацыі не будзе. Тут усё зразумела. Але пры чым тут мінулы год?»

Паводле слоў галоўнага спецыяліста Мінскага абласнога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Слуцкага раёна Андрэя Янука, ён меў гутарку і з гэтай заяўніцай, і з іншымі, тлумачыў ім сутнасць справы. Відавочна, людзі некаторыя рэчы проста не так зразумелі.

— Па-першае, пачнём з таго, што на ўліку па горадзе і раёне ў цэлым маецца 158 дзяцей-інвалідаў з дзяцінства, якія маюць права на аднаразовае санаторна-курортнае лячэнне. Аднак апошніх за ўвесь мінулы год мы атрымалі толькі 9. Як задаволіць усіх? — тлумачыў Андрэй Іванавіч. — Да таго ж сям'і Дрозд такая пуцёўка выдзялялася ў 2006 годзе. Па-другое, пра адмену выплаты кампенсацыі за нявыкарыстаную ў 2007 годзе санаторна-курортную пуцёўку гаворкі пакуль не вялося. Усе дакументы на тых, хто мае права на яе атрыманне, сапраўды даўно падрыхтаваныя. Але справа ў тым, што адпаведнае рашэнне па выплатах павінен прыняць або Савет Міністраў, або, скажам, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Як правіла, гэтым жа дакументам зацвярджаецца і памер кампенсацыі. У мінулыя гады ён складаў 10 базавых велічынь, якія, пасля прыняцця адпаведнага рашэння, выплачваліся ў лютым — сакавіку. Як толькі такі дакумент з'явіцца, усе падрыхтаваныя дакументы будуць накіраваны для выплаты сродкаў з пенсійнага фонду.

Што датычыцца цяперашняга года, зразумела, усе спецыялісты чыталі адпаведны Закон. Але як канкрэтна будзе весціся забеспячэнне дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў пуцёўкамі, як будуць вырашацца іншыя пытанні, гаварыць пакуль заўчасна, паколькі нейкіх падрабязных інструкцый ці тлумачэнняў яшчэ няма.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРАМ ПАМЯЦІ

Сёлета споўніцца 300 гадоў з дня бітвы пад вёскай Лясная на Слаўгарадчыне

У 1708 годзе рускія войскі на чале з Пятром I пабілі шведаў. Бітву пад Лясной называюць «маці Палтаўскай перамогі» — так напісана на помніку, усталяваным у цэнтры вёскі сто гадоў таму.

Лясная і Слаўгарад са званіцы

— Вось тут была бітва: рускія наступалі, а шведы трымалі абарону, — паказвае з аглядная пляцоўкі званіцы царквы айцец Георгій, настаяцель Свята-Пятра-Паўлаўскага храма-помніка.

Выгляд са званіцы — цудоўны, які апраўдаў выпрабаванне пад'ёму. Жалезная спіральная лесвіца мае поручні толькі з аднаго боку. Хоць, гавораць, бабуля Ніна Канстанцінаўна спрытна ўзлятае наверх, калі трэба званіць маладым на вясельным абрадзе.

На званіцы — будаўнічыя рыштаванні, кінутыя матэрыялы і рамонтныя прылады. Святар спадзяецца, што хутка рэстаўрацыйныя работы будуць адноўленыя. Да юбілею з дня бітвы пад Лясной царкву і ўсю вёску мяркуюць прывесці ў парадак.

Лясная — вялікая вёска за 14 кіламетраў ад раённага цэнтра Слаўгарада. Праўда, за часам той вялікай гістарычнай падзеі ён называўся Прапойскам. Гэта адзін з самых старажытных гарадоў на Магілёўшчыне — ён дакументальна вядомы з XII стагоддзя, калі смаленскі князь распарадзіўся ў сваёй грамаце браць подаць з падуладных паселішчаў, і з Прапою — 10 грывень. Толькі пасля вайны, у 1945 годзе, паводле слова Іосіфа Сталіна пра «слаўны горад», Прапойск стаў Слаўгарадам.



Абраз Маці Божай Смаленскай XVIII стагоддзя, які пасля рэвалюцыі служыў савецкаму актывісту прыступкай да калодзежа.

Бітва і царква Пятра I

Каб распавядаць пра гісторыю Лясной ды бітву рускіх са шведамі, у царкве арганізавалі цэлую выставу. Айцец Георгій расказвае, што трыста гадоў таму ў Лясной была драўляная царква. Яна стаяла на могілках, і шведскі генерал Левенгаўпт з яе назіраў за ходам бітвы. Тады царква была разбурана, але ўжо на наступны дзень Пётр распарадзіўся, каб новая царква ў гонар перамогі, хоць бы начарна, была пабудавана. І за некалькі дзён у Лясной сапраўды з'явілася царква, якую народ зваў Пятроўскай.

Яна прастаяла толькі сорак гадоў, пакуль мясцовы памешчык не распарадзіўся перавезці яе пад Чавусы, у вёску Галавенчыцы. І толькі ядры і абломкі вайсковай амуніцыі на сялянскіх падворках нагадвалі пра гістарычную бітву.

Пра неабходнасць увекавечыць перамогу рускіх над шведамі пад Лясной звярнуў увагу ў XIX стагоддзі вядомы гісторык і этнограф Еўдакім Раманаў. У 1905 годзе сяляне з Галавенчыцаў вырашылі пабудаваць новую царкву, а старую зламаць на дровы. І Раманаў павінен быў паглядзець, ці ёсць у той царкве нешта каштоўнае і цікавае.

— І ён убачыў у той царкве царскі вензель, — захоплена працягвае айцец Георгій. — Яму патлумачылі пра Пятра I і пераезд царквы. І гісторык прапанаваў перавезці будыніну ў Лясную. Маўляў, хоць царква і не вылучаецца архітэктурнай вытанчанасцю, але яе будавалі салдаты-пераможцы. Можа і сам Пётр якое бервяно счасаў! І магілёўскі епіскап пагадзіўся. Так у 1907 годзе у Лясной зноў адкрылася царква.

За супакой душаў ваяроў

Пра гэтую падзею напісалі ў той час газеты. У Расіі ўзгадалі, што набліжаецца 200-гадовы юбілей з дня бітвы. З гэтай нагоды правялі ўрачыстасці, вайсковы парад, устаявалі помнік у гонар пераможцаў і паклалі першы камень у падмурак новага храма.

У той год таксама з'явіўся абеліск на могілках, дзе была брацкая магіла рускіх салдат. У савецкі час ён быў павалены і з яго быў збіты крыж, але цяпер помнік на могілках адноўлены.

У бітве загінула 1111 рускіх — такія афіцыйныя лічбы. Шведы мяркуюць, што болей. У іх кнігах бітва дасюль называецца «катастрофай пад Лясной». Шведы страцілі ў той бітве значна болей людзей.

Пётр I, лічыць айцец Георгій, менавіта для таго і пабудаваў у Лясной царкву, каб памінаць за супакой душаў тых, хто загінуў у тым вялікім баі. І ў дзень бітвы — 28 верасня па старым стылі, 11 кастрычніка па новым — тут адбываецца богаслужэнне, і сельская грамада ўскладае кветкі да помніка. Святар хацеў бы, каб людзі і ўлады памяталі пра спадчыну не толькі ў дні юбілеяў, а заўсёды.

Сведчанні гісторыі

У савецкі час храм стаў калгаснай уласнасцю. Ён адкрываўся на кароткі час пры нямецкай акупацыі. А так тут быў склад. А з 1958 года — музей. Дарэчы, вялікі іканастас захаваўся і ў музеі — яго проста адсунулі да сцяны. І хоць яго неаднаразова і настойліва патрабавалі прыбраць, але ўсё ж не паднялася рука знішчыць. Са старога іканастаса захаваўся толькі адзін абраз: у ім добра бачна дзірка ад стрэлу.

Пасля таго, як будынак вярнулі царкве, тут адбыўся пажар. У 2002 годзе агонь знішчыў будаўнічыя рыштаванні і пашкодзіў купал. Калі чысцілі скляпенне, то знайшлі надпіс: «В. Гайдупеня. 13 апреля 1912 г.». Відаць, нехта з будаўнікоў пакінуў яго на свежай цэментнай паверхні.

А ў 1958 годзе, калі ў царкве быў рамонт, на самым версе знайшлі шкілет чалавека і нямецкую стрэльбу. Пра гэта старшыні мясцовага сельскага Савета Сцяпану Байцову распавядалі ляснянскія старажылы.

Цудатворная Маці Божая Казанская

Улетку народу ў царкве болей. Цяпер жа ў будынку царквы халадней, чым на вуліцы. І ў час службы людзі выходзяць на прыступкі пагрэцца. Калісьці былі ў царкве печкі, а ў сценах — дымаходы. Але сучасныя будаўнікі не могуць разабрацца, як яны працавалі. У савецкі час музей абаграваўся электрычнасцю і нават асвятляўся знутры ў цёмны час, каб было прыгожа. Але ўжо мінулі тыя часы, калі энергію не эканомілі і грошай не лічылі.

Над галоўным уваходам у царкву — вязь, узор з літараў царкоўнаславянскай мовы: «У лета на Нараджэнне Хрыстова тысяча семьсот восьмае. Імператар Пётр». На фасадзе — мазаічны абраз Казанскай Божай Маці, які заўсёды быў на полі бою разам з рускімі воінамі.

Дарэчы, летась царкве падарылі яшчэ адзін абраз Казанскай Божай Маці. Іван Аляксеевіч, цяпер 90-гадовы дзядуля, у дзяцінстве разам з бацькамі пакінуў родныя мясціны і паехаў па лепшае жыццё ў Сібір. Там мары не спраўдзіліся: бацька памёр, галадалі. У маці зусім апусціліся рукі, калі сын сказаў, што трэба вяртацца дадому. Яны ўзялі з сабой толькі абраз і, насуперак усім сумненням, даехалі жывыя. Ім шчасціла на людзей, якія ім дапамагалі і давалі ежу. Абраз захаваўся і цяпер будзе ўпрыгожваць царкву ў Лясной.

Абразы і лёсы

Айцец Георгій проста заварожвае цікавымі гісторыямі пра абразы і людзей. Напрыклад, на выставе прадстаўлены драўляны абломак, і толькі ўважлівы чалавек распазнае сюжэт Хрышчэння. Гэта частка іканастаса з той самай Пятроўскай царквы. Яна была зачынена ў часы калектывізацыі і разбурана. Іканастас секлі сякерамі. Жанчына ўвечары загарнула гэты кавалак у фартух і хавала яго ў доме. Яна дажыла да адкрыцця царквы ў 1992 годзе і прынесла сваю захаваную спадчыну.

Побач — абраз Божай Маці Смаленскай, таксама XVIII стагоддзя.

— Тут у акрузе было з дзесятак цэркваў, — расказвае святар. — І пасля закрыцця адной з іх у 1930-х гадах мясцовы жыхар гэты абраз паклаў каля калодзежа. Ён наступаў на яго, каб не замачыць ногі, калі браў ваду. Там абраз і трэснуў. Адна жанчына цішком забрала яго сабе. Ад яе я даведаўся пра гэту гісторыю — бабуля Марыя была 1907 года нараджэння. Яна тады вельмі баялася, бо сусед сказаў ёй, што ведае, куды знік абраз. А жанчына лагодна параіла яму ладзіць з людзьмі. І актывіст савецкай улады ўсё ж не данёс на яе. А потым і яму не сталі помсціць пры немцах. Можа, і гісторыя з абразом адбілася на лёсе.



Храм-помнік у Лясной: на фасадзе — мазаічны абраз Казанскай Божай Маці, над уваходам — царкоўнаславянская вязь: «У лета на Нараджэнне Хрыстова тысяча семсот восьмае. Імператар Пётр».

Помнік, усталяваны ў Лясной сто гадоў таму.

Як крамлёўская вежа і купал «цыбулінай» — я да гэтага падобныя толькі ў кніжках казак бачыў.

Георгій калісьці выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школе, а пазней стаў выкладчыкам Мінскай духоўнай семінарыі. Ён — кандыдат багаслоўскіх навук і да нядаўняга часу рэдагаваў часопіс «Магілёўскія епархіяльныя ведамасці». Цяпер жыццёвы шлях прывёў айца Георгія на радзіму: даглядаць бацькоў, служыць людзям і Богу.

— Не, мне тут не сумна, — усміхаецца святар. — Мяне ж не прасцё ў вёску саслалі: я служу ў Лясной — а гэта ўнікальнае месца. Вандроўнікі часта здзіўляюцца, што сельскі бацюшка нешта цікавае распавядае. А я ім кажу: «Ці не думалі вы, што поп толькі кадзілам махае?» Я тут з людзьмі, і гэтыя зносіны прыносяць мне радасць.

Юбілейныя дамы

Помнікам 250-гадоваму юбілею з дня бітвы пад Лясной сталі... два цагляныя двухпавярховыя дамы, якія стаяць непадалёк ад цэнтральнай плошчы вёскі і царквы. У той час яны былі ўзорам сучаснага домабудавання. Дамы ацяпляюцца печкамі, там няма каналізацыі. Прайшло паўстагоддзя, і да 300-гадовага юбілею з дня бітвы ў дамах зробяць рэканструкцыю, і ў іх жыхароў нарэшце з'явіцца цёплыя ванныя і прыбіральні.

Якраз тады і газета «Звязда» пісала аб падрыхтоўцы да юбілею. Напрыканцы лістапада 1956 года на старонках газеты змясцілі фота царквы, дзе быў мемарыяльны музей, і артыкул пра помнікі рускай славы. Усё гэта раскапаў у краязнаўчым архіве абласной бібліятэкі айцец Георгій.

А калі гаварыць пра падрыхтоўку да сёлетняга юбілею, то арганізацыйны камітэт ужо працуе. Па-першае, плануецца прывесці ў парадак саму вёску Лясная, якая стане аграгарадком. Тут мяркуецца ўзвесці новы Дом культуры, адкрыць спартыўны клуб і зрабіць адкрытую спартыўную пляцоўку, адрамантаваць амбулаторыю, бібліятэку і пошту. Будзе новая крама і камбінат бытавых паслуг. У межах праграмы адраджэння вёскі пабудуюць новыя домікі.

— Тут працы будзе зашмат, — расказвае старшыня Лапаціцкага сельскага Савета Сцяпан Байцоў. — У Лясную даўно не рабілі вялікіх капіталаўкладанняў — ва ўсякім разе, апошнія дзесяць гадоў. Вуліцы асфальтаваліся пасля Чарнобыльскай аварыі. І толькі ў апошнія гады тут з'явілася вуліца з новых домікаў — Маладзёжная. Цяпер будзе магчымасць зрабіць вёску, якая б адпавядала сучаснаму ўзроўню. Таму вяскоўцы — у Лясной амаль чатыры сотні жыхароў — жывуць надзеяй на лепшае. І таксама гатовыя зрабіць свой уклад у агульную справу.

Беларусы, рускія і шведы

Сцяпан Байцоў памятае, як ў Лясную ў 2001 годзе прыязджала група шведаў. Гэта былі гісторыкі і выкладчыкі, якія арганізавалі паездку ў Лясную праз маскоўскую турфірму.

— Яны падняліся на аглядную пляцоўку на званіцы і расклалі карту, — узгадвае старшыня. — На той карце былі нават хаты, якія трыста гадоў таму былі ў вёсцы. І ў мяне пыталіся, дзе тут тры рэчкі, ля якіх шведскія войскі занялі абарону? Адну я так і не вызначыў — той ракі ўжо няма. Шведы потым паехалі ў Палтаву.

Невядома як са шведамі, але дакладна, што ва ўрачыстасцях у Лясной будзе браць удзел дэлегацыя з Расіі. Нібыта і пэўныя грошы з бюджэту Саюзнай дзяржавы будуць выдаткаваны на падрыхтоўку да юбілею.

— Гэта значная падзея, — каментуе намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Мікалай Мірончанка. — Так распарадзілася гісторыя, што на нашай зямлі ваявалі, і тут вырашаліся лёсы вялікіх дзяржаў. Столькі крыві праліта за той невялікі кавалак зямлі! Безумоўна, у той час гэта была, мякка кажучы, малапрыемная падзея. А сёння — гістарычная рэліквія.

Спецыяльна да юбілею пасадзяць Сад сяброўства і згоды. Будзе і рэканструкцыя вайсковых пахаванняў — і рускага, і шведскага. У час святкаванняў адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя.

— Гісторыю трэба паважаць, тым больш што тут такія падзеі адбываліся! — упэўнена старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў Таццяна Кананчук. — Мне падаецца, што мы ўсё ж такі мала вучым дзяцей гісторыі роднага краю. Калі я працавала ў школе, аднойчы павезла малых у Пушкінскія Горы, і там яны ўбачылі карціны, дзе Пётр I і наша Лясная. Вось тут яны загнарыліся роднымі мясцінамі!

Дарэчы, сто гадоў таму, у 1908 годзе месца для храма ў Лясной асвячаў Мітрапаліт Мітрафан Краснапольскі, які цяпер прылічаны праваслаўнай царквой да ліку святых.

Ён тады сказаў літаральна наступнае: «Пройдуць часіны, зменяцца пакаленні, і можа быць праз якое стагоддзе будучыня нашчадкі збяруцца ў гэты дзень на полі бою, якое чырванела ад крыві продкаў. І велічны храм, які ўзвысіцца, раскажа ім пра былыя подзвігі рускіх волатаў, якія касцьмі сваімі палеглі за шчасце Айчыны». Гэта зварот прама да нас — людзей, якія ў 2008 годзе адзначаць 300-годдзе з дня бітвы пад Лясной.

Ілона ІВАНОВА.

Слаўгарадскі раён.

Пытальнік

Пенсія ўзрасце на 14—16 працэнтаў. Але «графік» яшчэ невядомы

— Зараз мне 77 гадоў, атрымліваю працоўную пенсію, жыву разам з жонкай-пенсіянеркай. У кастрычніку мінулага года мне была вызначана I група інваліднасці, і ў сувязі з гэтым хачу запытацца: на якія льготы я зараз маю права? І яшчэ. Адкажыце, калі ласка, калі чакаць наступнага пераразмеркавання пенсій?

Міхаіл Мікалаевіч Зубко, *Нясвіжскі раён*

— Спачатку наконт ільгот. Зараз інваліды I і II груп (апроч асобаў, якія атрымалі інваліднасць у выніку парушэння закона, з прычыны алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення ці з прычыны наўмыснага пашкоджання ўласнага здароўя) маюць права на 90-працэнтную скідку з кошту лекаў і неабходных матэрыялаў пры наяўнасці адпаведных рэцэптаў ці медыцынскіх заключэнняў, на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў, на забеспячэнне іншымі сродкамі тэхнічнай рэабілітацыі, на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне (для працуючых) ці забеспячэнне санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем на ўмовах частковай аплаты (для працуючых), на бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога і прыгараднага (апроч таксі) пасажырскага транспарту, а таксама на міжгароднім аўтамабільным транспарце ў межах свайго раёна. Нарэшце, некаторыя інваліды I і II груп маюць права на 50-працэнтную скідку з кошту тэхабслугоўвання і камунальных паслуг. Аднак апошняя гарантыя датычыцца толькі асобаў, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, пражываюць адны, разам з такімі ж інвалідамі I і II груп ці з непрацуючымі пенсіянерамі, што дасягнулі агульнага пенсійнага ўзросту.

Што ж да другога пытання, то тут можна назваць толькі агульныя лічбы. Як паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва, чакаецца, што на працягу гэтага года сярэднія пенсіі ў краіне павялічацца на 14—16 працэнтаў. Аднак канкрэтны графік іх пераразмеркавання невядомы — ён будзе залежаць ад тэмпаў росту сярэдняй зарплаты па краіне. Дарэчы, Міхаіл Міхайлавіч, варта зрабіць адну заўвагу — вам, як інваліду I групы, павінна быць прызначана надбаўка на догляд. А вось ці прызначана яна і ці з'явіліся ў вас у сувязі з новым статусам якія-небудзь падставы для пераразмеркавання пенсіі, лепш даведацца на месцы — у раённым упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

НЕ НА ТУЮ НАПАЛІ!

У Браслаўскім раёне 80-гадовая старая прымусіла рэцыравацца з месца злачынства двух 20-гадовых злачынцаў, расказалі ў аддзяленні грамадскіх сувязяў і інфармацыі УУС Віцебскага аблвыканкама. Двое грабежнікаў уварваліся ў незачынены дом адзінокай пенсіянеркі, спадзеючыся знайсці схаваныя ёю грошы. Аднак звязаць сваю ахвяру і закрыць ёй рот, як прадугледжваў зладзейскі план, не ўдалося. Злоснае супраціўленне жанчыны разам з гучным крыкам зрабілі сваю справу: своечасова падаспелі суседзі, а злачынцы ўцяклі з месца злачынства. Устанавіць іх асобы ўдалося даволі хутка, і цяпер супраць іх узбуджана крымінальная справа. Супрацоўнікі міліцыі ўсё ж папярэджваюць, што адзінокім людзям сталага ўзросту варта быць асабліва прадбачлівымі, не расказваць аб сваіх зберажэннях чужым людзям і зачыняць дзверы.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

«МТС — аграгарадкам»

ЯНАВІЧЫ: карабель з «мабільнай» мачтай

Зіма на дварэ. І міжволі зноў хочацца цеплыні. А, быццам, яшчэ нядаўна правіла баль восень залатая.

Тады, у гэты цудоўны час года, рыхтуючы матэрыял для нашай традыцыйнай рубрыкі «МТС — аграгарадкам», я завітаў у пасёлак Янавічы Віцебскага раёна. Памятаецца, калі ехаў у цёплы восеньскі дзянёк на рэйсавым аўтобусе ў службовую камандзіроўку, кінуліся ў вочы ўказальнікі з дзіўнымі назвамі тутэйшых вёсак: Казанова, Мішуткі, Чыжыкі... І ў кожнага гэтага населенага пункта свая гісторыя, расказаць якую, напэўна, не хапіла б і газетнай паласы...

Яшчэ па дарозе я пачуў шмат цікавага пра гэтыя мясціны. Напрыклад, тое, што калісьці недалёка ад пасёлка знаходзіўся запасны ваенны аэрадром, дзе, як і ў Віцебску на аэрадроме «Журжава», маглі садзіцца самалёты — так расказалі мне суразмоўцы. Яны нават паказалі былое лётнае поле...

І вось яны — непаўторныя Янавічы. У свой час тут знаходзілася яўрэйскае мястэчка. У 1930-ыя Янавічы атрымалі статус пасёлка. Зараз тут пражывае каля тысячы чалавек. Да іх паслуг працуюць банк, пошта, дзейнічаюць бальніца, школа. У сярэдняй школе вучацца больш за 200 хлопчыкаў і дзяўчатак. Нават свае пажарныя ёсць у Янавічах.

Падчас падарожжа па пасёлку зайшоў у мясцовыя крамы. Як і ў горадзе, тут, акрамя іншага, рэалізуецца і бытавая тэхніка. Развіваюць у гэтых мясцінах і аграгурызм: адна сядзіба ўжо прымае турыстаў. Упрыгожвае Янавічы праваслаўная царква.

Аграгарадок будуецца хуткімі тэмпамі. У хуткім часе плануецца завяршыць рамонт будынка мясцовай адміністрацыі. Сярод жылых збудаванняў выдзяляюцца прыгожыя індывідуальныя дамы для спецыялістаў. Сёлета іх стане на 19 больш.

У пасялковым выканаўчым камітэце мне расказалі, што сувязь МТС прыйшла ў Янавічы ў 2006-м. Але месцічам здаецца, што гэта было даўно: так хутка прывыкаеш да дабрага. Вышка сувязі МТС узвышаецца над пасёлкам, быццам мачта над караблём.

Недалёка ад аграгарадка — мяжа з Расійскай Федэрацыяй. Два бакі яднае не толькі супрацоўніцтва праваахоўных органаў і іншых структур, але і міжнародны брэнд МТС.

Беларуска-расійскае сумеснае ТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» стабільна працуе на карысць беларусаў, робіць свой унёсак у нацыянальную эканоміку. За гады існавання кампаніі МТС стала найбуйнейшым нацыянальным сотавым аператарам і зрабіла мабільную сувязь даступнай кожнаму жыхару Беларусі. Цяпер МТС замацоўвае свае пазіцыі.

Віцябчанін Рыгор ЛЯДМАН заўсёды на сувязі, дзякуючы МТС. На заднім плане — Янавіцкі комплексны прыёмны пункт.

Пашыраецца тэрыторыя краіны, дзе даступна сувязь ад МТС. Сотні, тысячы такіх жа населеных пунктаў, як Янавічы, намаганнямі супрацоўнікаў МТС, круглы год у любы час і ў любое надвор'е заўсёды застаюцца «мабільнымі». Упэўніцца ў гэтым вельмі проста: трэба толькі наведаць правінцыю, якую кампанія МТС надзейна звязала з усім светам.

Сёлета мы з вамі зноў адправімся ў цікавае падарожжа па аграгарадках Віцебшчыны, дзе МТС актыўна ўкараняе сучасныя тэхналогіі мабільнай сувязі. Будуць новыя артыкулы, новыя нататкі, прысвечаныя «мабілізацыі» малых населеных пунктаў. Дарэчы, кожны з нашых чытачоў можа падзяліцца сваімі думкамі па тэме, патэлефанаваўшы ў віцебскі карпункт «Звязды».

Вядучы рубрыкі Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТЭРЫТОРЫЯ, НЕСПРЫЯЛЬНАЯ ДЛЯ КАРУПЦЫЯНЕРАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У якіх сферах праявы карупцыі назіраліся найчасцей?

— Найбольшая колькасць злачынстваў карупцыйнага віду была выяўлена ў аграпрамысловым комплексе — 116 фактаў парушэнняў закона, у сферах дзяржаўнага кіравання — 72, у гандлі — 50, у будаўнічай галіне — 17.

— Наколькі аб'ектыўна гэтая статыстыка адлюстроўвае рэальную «карупцыйную сітуацыю» ў вобласці?

— Карупцыя мае латэнтны (скрыты) характар. Таму, безумоўна, толькі на падставе выяўленых парушэнняў закона нельга меркаваць аб яе агульным узроўні ва ўсіх сферах нашага жыцця. Бо адсутнасць крымінальных спраў карупцыйнай катэгорыі ў дачыненні да прадстаўнікоў пэўнай галіны народнай гаспадаркі ці ўстаноў сацыяльнай сферы, аховы здароўя альбо адукацыі, само па сабе не сведчыць, што там няма хабарніцтва, злоўжывання становішчам, крадзяжкоў, прыпісак і г.д. Зусім верагодна, што гэта звычайная недапрацоўка антыкарупцыйных падраздзяленняў праваахоўных органаў. Так што мы не даём «спачываць на лаўрах» барацьбітам з карупцыяй і патрабуем, каб яны звярталі ўвагу нават на самыя дробныя факты хабарніцтва, гэтак званыя «паборы».

— Нават, калі «крыхаборствам» займаецца не чыноўнік, а, напрыклад, слесар-сантэхнік? Дзе, дарэчы, найбольш часта шчыруюць дробныя хабарнікі?

— Паводле нашых звестак, найбольш распаўсюджаны дробныя «паборы» ў сферы адукацыі і аховы здароўя. Гэтая негатыўная з'ява летась мела месца і на прадпрыемствах, якія праводзяць тэхнічны агляд аўтатранспарту. У Маладзечне, Жодзіне і Клецку такія хабарнікі ўжо панеслі пакаранне.

Для чалавека, які вымушаны даваць нават нязначную суму хабару, як правіла, усё роўна, хто займаецца «паборамі», адказны чыноўнік ці ўзгаданы вамі сантэхнік. «Бытавая» карупцыя таксама наносіць даволі адчувальны ўдар па маральных асновах грамадства. Самае страшнае не ў суме хабару. Хоць для людзей пенсійнага ўзросту, напрыклад, і дзесяць тысяч рублёў немалыя грошы. Галоўная небяспека дробнага хабарніцтва ў тым, што яно, вобразна кажучы, раз'ядае свядомасць людзей. Многія суграмадзяне не толькі не пратэстуюць супраць такіх «паборaў», а ўспрымаюць падобную «практыку» ўзаемаадносінаў як належнае. Вось гэта і ёсць самая трывалая аснова для карупцыі. Бо, насамрэч, найменш карумпаваныя якраз тыя краіны, грамадзяне якіх не схільны даваць хабар.

— Але ў нашай краіне бываюць выпадкі, калі чыноўнікі ці нават «крыхаборы» не пакідаюць людзям права на сумленны выбар, фактычна заганяюць іх у «карупцыйны кут». Больш за тое, некаторыя нядобрасумленныя супрацоўнікі праваахоўных органаў пад прыкрыццём гэтак званага аператыўнага эксперыменту падчас правакуюць грамадзян на хабарніцтва.

— Сапраўды, слушная заўвага. Такія факты, на жаль, маюць месца. Але мы вядзём бескампрамісную барацьбу і з карупцыянерамі ў пагонах, і з тымі прадстаўнікамі праваахоўных органаў, якія правакуюць людзей на хабарніцтва. Пракуратура вобласці ўзбудзіла 3 крымінальныя справы супраць міліцыянераў, якія ў пагоні за «антыкарупцыйнымі паказчыкамі» пераступілі закон. У адным выпадку вартавыя правапарадку, нягледзячы на тое, што пракуратура адмовіла ў санкцыі, усё ж правялі незаконны аператыўны эксперымент. Па дзвюх астатніх крымінальных справах праходзяць міліцыянеры, якія самі ж правакавалі і падбухторвалі грамадзяніна да хабарніцтва, а таксама незаконнымі дзеяннямі спрабавалі прымусіць службовую асобу прызнацца ў атрыманні хабару. Такая барацьба з карупцыяй нам не патрэбна. У арсенале супрацоўнікаў праваахоўных органаў ёсць дастаткова законных спосабаў барацьбы з хабарнікамі, раскрадальнікамі маёмасці і іншымі нядобрасумленнымі асобамі. Дарэчы, летась у сталічным рэгіёне былі ўзбуджаны крымінальныя справы супраць 16 вартавых правапарадку, якія ўчынілі службовыя злачынствы.

— А як часта выяўляюцца «класічныя» віды карупцыі. Я маю на ўвазе выпадкі, гэтак званага «адкату», які робяць камерцыйныя структуры службовым асобам за выгадныя дамовы.

— *Падобныя факты таксама ёсць. Вось толькі некалькі яскравых прыкладаў.*

У Крупскім раёне кіраўнік мясцовай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, выкарыстоўваючы сваю пасаду, фактычна прымусіў падначаленага яму дырэктара заказніка набыць у камерсантаў інфармацыйныя і памежныя знакі. Тэндар, як патрабуе заканадаўства ў такіх выпадках, не праводзіўся. У выніку заказніку быў нанесены ўрон на 41 мільён рублёў.

Службовыя асобы Дзяржынскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі, таксама без правядзення тэндару, набылі ў сталічнай фірмы камплект абсталявання на 94,5 мільёна рублёў. Насамрэч, як высветлілася, рэальны кошт абсталявання складаў 20,5 мільёна рублёў.

Зрэшты, некаторыя чыноўнікі ўхітраюцца і ў выніку тэндару заключыць нявыгадны для бюджэту вобласці кантракт. Напрыклад, службовыя асобы ўпраўлення па фізічнай культуры, спорце і турызме аблвыканкама падчас набыцця паветраапорнага збудавання для патрэбаў горада Барысава, чамусьці аддалі перавагу славенцам. Хоць жодзінская фірма прапанавала збудаванне з аналагічнымі тэхнічнымі характарыстыкамі амаль на 44 мільёны рублёў танней. Толькі пасля ўмяшання пракуратуры вобласці кантракт са славенцамі быў скасаваны.

Значны ўрон наносяць чыноўнікі, якія карыстаюцца паслугамі пасрэдніцкіх фірмаў. Так, былы першы намеснік Смалявіцкага райвыканкама арганізаваў набыццё камбікорму і пастаўку яго сельгаспрадпрыемствам за здзенае малако. Пакуль вагоны з камбікормам ехалі да пакупнікоў, камерсанты некалькі разоў паспелі іх перапрадаць адзін аднаму. А ў выніку кошт камбікорму быў завышаны на 113 мільёнаў рублёў.

— Міхаіл Валянцінавіч, дзякуючы ўнікальнаму геаграфічнаму становішчу Мінскай вобласці зямельныя ўчасткі, асабліва паблізу сталіцы, а таксама ў маляўнічых мясцінах, непадалёк ад вадаёмаў, карыстаюцца шалёным попытам. Як часта зямля ў рэгіёне становіцца прадметам карупцыйных здзелак?

— У 1993—2003 гадах вобласць перажывала гэтак званы «зямельны бум». Дакладнага прававога рэгулявання парадку прадастаўленых зямельных участкаў не было. Мясцовыя чыноўнікі карыстаючыся гэтым пралазам у заканадаўстве стварылі «ўрадлівую глебу» для карупцыі. Некаторыя прадпрымальныя асобы пры патуранні чыноўнікаў мясцовых органаў улады завалодвалі некалькімі участкамі, а потым за вялікія грошы прадавалі. Да «зямельнага бізнэсу» далучыліся і некаторыя мясцовыя кіраўнікі. Напрыклад, выконваючая абавязкі старшыні Каладзішчанскага сельскага выканаўчага камітэта займалася незаконнай канфіскацыяй зямлі ў людзей. Потым гэтыя ўчасткі афармляла на падстаўных асобаў і рэалізоўвала праз рыэлтарскія фірмы. У выніку пацярпелі некалькі дзесяткаў чалавек, агульная сума ўрону перавысіла 36 мільёнаў рублёў. Карупцыянерка, дарэчы, асуджана да трох з паловай гадоў пазбаўлення волі. І гэта не адзінкавы факт. Летась пракурорамі Мінскай вобласці было праведзена 189 праверак выканання зямельнага і прыродаахоўнага заканадаўстваў. Было ўстаноўлена 115 фактаў самавольнага будаўніцтва, 187 выпадкаў захопу ўчасткаў, 125 іншых парушэнняў закона. Па выніках праверак было ўзбуджана 15 крымінальных спраў, 443 асобы прыцягнуты да адміністрацыйнай і дысцыплінарнай адказнасці.

— Агульнавядома, што любое злачынства лягчэй папярэдзіць, чым потым выявіць. Якія аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары садзейнічаюць карупцыі ў Мінскай вобласці?

— Яшчэ ніводнай дзяржаве ў свеце не ўдалося зусім выкараніць карупцыю. Нават у тых краінах, дзе за хабарніцтва прадугледжана смяротная пакаранне, ёсць нядобрасумленныя, прадажныя чыноўнікі і іншыя службовыя асобы. Таму я найперш вылучыў бы менавіта чалавечы фактар. Зразумела, што нават пры дапамозе «дэтактара хлусні» не заўсёды магчыма разгледзець карупцыянера ў тым ці іншым прэтэндэнце на адказную пасаду. Аднак бываюць выпадкі, калі такія асобы бачныя і няўзброеным вокам. Вось адзін такі прыклад. Некалькі гадоў таму на пасаду дырэктара камунальнай гаспадаркі аднаго з раёнаў вобласці быў прыняты грамадзянін Б. Хоць гэты чалавек толькі што вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі, дзе адбываў пакаранне за атрыманне хабару і службовы падлог. Неўзабаве ён «вызначыўся» і на новай пасадзе: нанёс урон прадпрыемству больш чым на 14 мільёнаў рублёў. А зараз гэты «каштоўны кадр» з'яўляецца адным з кіраўнікоў у сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі сталіцы. Шчыра кажучы, мне зусім незразумелы такі падбор кадраў.

Хоць увогуле ў нашай дзяржаве прымаецца дастаткова мераў для выкаранення карупцыі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ



***

Вучуся зноў роднаму слову
я ў ціхіх лугоў і палёў,
у кветак прыгожых вясновых,
ў празрыстых прыдзвінскіх гаёў.
У песень, што ноччу купальскай
над вечнай прасторай плывуць,
якія крыніцай кастальскай
бруяцца і вечна жывуць.
У кніжных радках запаветных
Скарынавых мудрых прадмоў,
ва ўсмешках і позірках светлых
маіх дарагіх землякоў.
І ў Бога прашу блаславення,
каб ён між усіх сваіх спраў
даў роднаму слову натхненне,
жыццё яму вечнае даў.

***

Ёсць ісціны святыя,
Якія назаўжды...
Над полацкай Сафіяй
Аблокі як гады.
Над вечнаю Дзвіною.
Над ціхай Палатой,
Дзе лес густой сцяною,
Дзе сцішаны спакой.
Дзе кожны дворык мілы,
Дзе мой пачаўся лёс,
І дзе бацькоў магілы
Між соснаў і бяроз.
Дзе вузенькі завулак
Паміж дамоў пралёг, —
Маёй душы прытулак,
Майго жыцця выток.

***

На стык дарог пад ветра спеў
Я выйду ранішняй парою
І зноў душу сваю настрою
На музыку палёў і дрэў.

Я моўчкі пастаю ў цішы
І ў думках светлых захачу,
Каб музыку маёй душы
Яшчэ хоць нехта ў свеце чуў.

***

Нібы раскінуты абдымкі
І сэрцаў чуецца біццё...
Перабіраю фатаздымкі,
Гартаю ўласнае жыццё.

Якія светлыя імгненні,
Якое свята для душы,
Што нават хмараў чорных цені
Не перашкодзяць светла жыць.

І веру: скончыцца нянасце
І зноў захочацца спяваць,
Калі глядзіць са здымкаў шчасце,
Якое трэба захаваць.

***

Намалюй мяне, мастак,
У вясновым белым садзе,
І ў прымружаным паглядзе
Адшукай надзеі знак.

Намалюй бацькоўскі дом,
Мамы ўсмешку дарагую,
Ўсё, што ў сэрцы берагу я,
Што агортвае цяплом.

Прымацую на сцяне,
Буду ціха любавацца
Гэтай мастакоўскай працай,
Што жыццё прадоўжыць мне.

***

Я шчасця палавіначку
Пакаштаваў на зуб,
Правёўшы, як травіначку,
Па востраму лязу.

Яно заўжды баялася
Сталёвай вастрыні,
Яно заўжды хавалася
За стомленыя дні.

Ды верыў, што адпусціцца
І забуяе ўраз
Вясноваю распуціцай
Чароўная пара.

Абернецца крывіначкай,
Якую адшукаў,
Другою палавіначкай,
Што ўсё жыццё чакаў.

***

Як звычайна і проста,
Нібы дыхаць ці піць:
Трэба жыць па-за ўзростам,
Дзень наступны любіць.

І кахаць утрапёна,
І адхланяў шукаць,
Са слязою салёнай
Ля магіл пастаяць.

І адчуць як выснову,
Як натхнення прыліў,
Вернасць роднаму слову,
Вернасць роднай зямлі.

Учора вядомы беларускі паэт Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ адзначыў свой юбілей. Шчыра віншуем! Звяздоўцы.

«Светлая будучыня» Разанцаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паміж мінулымі і цяперашнімі паказчыкамі — толькі некалькі радкоў у газеце. А на справе гэта былі гады цяжкай і карпатлівай працы, якую ўвянчала першае месца па збожжы на «Дажынках-2007».

Старшыня Пётр Сцяпанавіч і цяпер працуе без выхадных дзён, працоўны дзень доўжыцца «колькі трэба для гаспадаркі» — звычайна ад світанку да захаду. З жонкай і старэйшым сынам бачыцца пераважна на працы, і ўсе незабітыя цвікі ў хаце, смяецца 46-гадовы кіраўнік, пачакаюць да яго пенсіі — пакуль нестае часу.

Лаўнікаў прыехаў на Мсціслаўшчыну маладым чалавекам па размеркаванні, шмат працаваў, не з'ехаў у цяжкія часіны, прыняў на сябе адказнасць за калгас. І ўрэшце ўсё атрымалася: тут павялічваюць аб'ёмы вытворчасці (толькі за 2007 год — на 17 %), заробак (сярэдняя лічба пераваліла за 400 тысяч рублёў), ручную працу замяніла тэхніка, палепшыліся ўмовы жыцця людзей.

Цяпер пасёлак Разанцы, дзе калісьці знайшлі прытулак чарнобыльскія перасяленцы і бежанцы з розных куткоў былых савецкіх рэспублік у пошуках спакойнага жыцця і заробку, не пазнаць. Тут па прэзідэнцкай праграме пабудавана паўсотні новых домікаў, дзе

За 10 гадоў аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі на Магілёўшчыне павялічыўся ў 2 разы, рознічны тавараабарот — у 4 разы. Экспарт перавысіў мільярд долараў.

Аб'ём інвестыцый у асноўны капітал узрос амаль утрая і летась перавысіў 2 мільярды рублёў. Да 2010 года ў вобласці будзе рэалізавана каля 200 інвестыцыйных і іншых праектаў, кошт якіх наблізіцца да 500 мільёнаў долараў.

Летась Магілёўскай вобласці ўпершыню ўдалося вырасціць і сабраць больш за мільён тон збожжа. У рэгіёне цяпер 116 аграгарадкоў, дзе было асвоена з 2005 года паўтрыльёна рублёў.

За дзесяцігоддзе заработная плата жыхароў Магілёўшчыны павялічылася ў 4 разы і цяпер у сярэднім па рэгіёне наблізілася да 700 тысяч рублёў.

ёсць газ і абсалютна ўсе гарадскія выгоды. Там цяпер жывуць маладыя людзі: у «Кастрычнік» прымаюць на працу грамадзян да 40 гадоў і спадзяюцца, што іх дзеці забяспечаць светлую будучыню аграгарадка Разанцы.

Лаўнікаў, сціплы чалавек, яшчэ мноства разоў паўтарыў, што поспехі гаспадаркі — гэта не яго асабістая заслуга, а ўсіх працаўнікоў «Кастрычніка». І што вялікіх ушанаванняў яны яшчэ не заслужылі, бо ўсё толькі пачынаецца!

Сёлета плануюць зрабіць рыбную сажалку, закласці сад, завяршыць будаўніцтва сучаснага жывёлагадоўчага комплексу, атрымаць яшчэ больш збожжа, малака і мяса. А яшчэ праз некалькі дзесяцігоддзяў Пётр Сцяпанавіч бачыць сваю родную гаспадарку высокатэхналагічнай, дзе працуюць працавітыя, адказныя і заможныя людзі.

Планы мсціслаўскага «Кастрычніка» — гэта малая частка агульных планаў развіцця вобласці.

— Я — ураджэнец Магілёўшчыны, і бачу, як мяняецца да лепшага наш рэгіён, — сказаў Пётр Лаўнікаў. — Якім я ўбачыў Мсціслаўскі раён 25 гадоў таму, калі прыехаў сюды жыць і працаваць, і цяперашні — гэта дзве вялікія розніцы. А Магілёў — тым больш! У нас усё робіцца для людзей. І я жадаю роднай вобласці на яе 70-годдзе і ўсім яе жыхарам дасягнуць яшчэ большых вынікаў у працы, каб павялічваўся дабрабыт людзей.

Ілона ІВАНОВА.

ПлацдАрм

ПЕРШЫ ПРЫЗЫЎ У ЮБІЛЕЙНЫ ГОД

З учарашняга дня пачалася адпраўка маладога папаўнення ў войскі, якая працягнецца да 31 студзеня. Першая партыя юнакоў, якім давядзецца праходзіць тэрміновую службу ў год 90-годдзя Узброеных Сілаў Беларусі, склала звыш 1100 прызыўнікоў, у тым ліку каля 250 жыхароў Мінскай вобласці і сталіцы. Наогул у гэты прызыў плануецца накіраваць на ўкамплектаванне Узброеных Сілаў і іншых вайсковых фарміраванняў каля 10 тысяч чалавек. Цырымоніі прыняцця ваеннай прысягі ў вайсковых часцях і злучэннях Узброеных Сілаў адбудзецца 9-га лютага.

Нягледзячы на працоўны дзень, праводзіць на службу сваё адзінае дзіця, 18-гадовага сына Паўла, да мінскага ваенкамата прыйшлі яго бацькі Аркадзь і Марына Мальчэўскія *(на фота)*. Тата шмат расказаў Пашы аб ваенных буднях, бо калісьці сам служыў. Праўда, не паўтара, а цэлых два гады, і за мяжой, у Венгрыі, у Паўднёвай групе войскаў, у артылерыі. «Я параіў сыну, каб ён не адрываўся ў арміі ад калектыву і заваёўваў аўтарытэт, — кажа Аркадзь Аляксандравіч. — Спадзяюся, што заняткі каратэ і кікбоксінгам дапамогуць сыну ў баявой падрыхтоўцы». «А для мяне як для маці галоўнае, каб Паша быў здаровым, — умяшалася Марына Васільеўна. — Хутчэй бы прысяга: паедзем да сына і пачастуем смакатой. Ён у нас любіць салодкае». Дарэчы, разам з сям'ёй Мальчэўскіх прыйшла і дзяўчына хлопца Марына Цалко. «Мы сустракаемся ўжо год. Як жа я магла прапусціць такую падзею? — здзівілася яна. — Абавязкова буду чакаць свайго каханага». І не дзіва, калі перад вачыма такі прыклад: маці Пашы чакала свайго будучага мужа і на працягу ўсёй службы пісала яму лісты — звыш 300.

Адпраўка юнакоў у той ці іншы род войскаў у Беларусі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з тэрытарыяльным прынцыпам. Праўда, існуюць выключэнні. Напрыклад, жыхары рэгіёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, накіроўваюцца на службу на незабруджаныя тэрыторыі. Акрамя таго, у кожным родзе войскаў існуюць свае патрабаванні. Улічваецца не толькі здароўе маладога чалавека, але і яго грамадзянская спецыяльнасць. У прыватнасці, уладальнікі вадзіцельскіх правоў становяцца вадзіцелямі, трактарысты вучацца кіраваць гусенічнай баявой ваеннай тэхнікай. Аб гэтым паведаміў палкоўнік Ігар Козел, намеснік начальніка галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сілаў.

Прызыўная кампанія гэтага года праходзіць з улікам змяненняў і дапаўненняў, якія былі ўнесеныя ў ліпені мінулага года ў Закон «Аб воінскім абавязку і воінскай службе». На сёння звыш 53 тысячам юнакоў прызыўнога ўзросту прадастаўлена адтэрміноўка. У асноўным для працягу адукацыі (46 тысяч чалавек).

Права на адтэрміноўку ад прызыву таксама атрымалі дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі, грамадзяне, чые родныя пацярпелі пры выкананні службовых абавязкаў, аспіранты (дактаранты) незалежна ад формы навучання, грамадзяне, якія былі адлічаны з навучальных устаноў, у тым ліку якія знаходзіліся за мяжой (за выключэннем адлічаных за непаспяховасць і недыскваліфікаванасць), грамадзяне, якія маюць цяжарных жонак.

Дарэчы, з 1 студзеня 2008 года дзейнічае банк даных аб грамадзянах, права якіх на выезд за мяжу часова абмежавана (тыя, хто адхіляецца ад прызыўных мерапрыемстваў).

Ірына ПРЫМАК. Фота Вольгі ЛАСКІ.

У 2008 годзе захаваецца рэгуляванне цэнаў на мяса-малочную прадукцыю

У Беларусі ў 2008 годзе захаваецца рэгуляванне цэнаў на мяса-малочную прадукцыю. Аб гэтым паведаміла намеснік дырэктара Дэпартамента цэнавай палітыкі Мінэканомікі Лідзія Купрэева на сумесным пасяджэнні Савета па развіцці прадпрымальніцтва Беларусі і Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Мінаблвыканкаме. «На Мінэканомікі ўскладзена функцыя рэгулявання цэнаў на мяса-малочную прадукцыю як на сацыяльна значную, і цэны на яе будуць рэгулявацца, — адзначыла Лідзія Купрэева. — Поўнасцю «адпусціць» сёння цэны ў Беларусі немагчыма і недапушчальна. Усе дзеянні ў галіне цэнаўтварэння павінны быць накіраваны на забеспячэнне стабільнага ўтварэння цэнаў і недапушчэнне іх рэзкага росту. Мы будзем вырашаць гэту задачу, у тым ліку і шляхам рэгулявання. Адначасова будзе вырашацца пытанне паляпшэння фінансавага стану прадпрыемстваў». У 2008 годзе будзе прадоўжана паэтапная работа па павелічэнню адпускных і рознічных цэнаў на прадукцыю аграпрамысловага комплексу. Прадстаўнік дэпартамента таксама паведаміла, што Мінэканомікі чакае прапановы як ад дзяржаўных прадпрыемстваў, так і ад прадпрымальнікаў па ўдасканаленні ў Беларусі працэсу цэнаўтварэння.

БЕЛТА.

Па фактах хуліганства ўзбуджана крымінальная справа

Як паведамляла ўжо «Звязда», 10 студзеня падчас правядзення несанкцыянаванага мерапрыемства ў Мінску былі затрыманы найбольш актыўныя парушальнікі грамадскага парадку.

Як паведаміў нашай газеце часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алег Слепчанка, сярод затрыманых — толькі трое прадпрымальнікаў. Пятнаццаць чалавек з 27 затрыманых аказаліся нідзе не працуючымі, яшчэ 8 — навучэнцамі ПТВ і іншых навучальных устаноў. Практычна ўсе парушальнікі — маладыя людзі 1986—1991 гадоў нараджэння. Паводле рашэння суда яны былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе арышту тэрмінам на 15—20 сутак. Трое непаўналетніх перададзены бацькам. У выніку прававой ацэнкі падзей, што адбываліся ў сталіцы на праспекце Незалежнасці 10 студзеня, пракуратурай Мінска ўзбуджана крымінальная справа па прыметах ч. 1 артыкула 342 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак альбо актыўны ўдзел у іх). Акрамя таго, упраўленнем папярэдняга расследавання ГУУС Мінгарвыканкама ўзбуджана крымінальная справа па фактах хуліганства, якое выявілася ў наўмысным пашкоджанні лабавога шкла і люстэрак некалькіх гарадскіх аўтобусаў, збіцці вадзіцеля аднаго з іх, а таксама актыўнымі перашкодамі руху транспарту і аказання супраціўлення супрацоўнікам міліцыі. Зараз праваахоўнікі ўстанаўліваюць асобы арганізатараў і актыўных удзельнікаў акцыі для прыцягнення іх да адказнасці ў рамках узбуджаных крымінальных спраў.

Ігар ГРЫШЫН.

Мінюст патрабуе тлумачэнняў ад палітычных партый

У суботу, 12 студзеня, Міністэрства юстыцыі распаўсюдзіла заяву, у якой гаворыцца, што 10 студзеня ў Мінску адбыўся несанкцыянаваны мітынг прадпрымальнікаў, падчас якога арганізатары і ўдзельнікі «груба парушылі заканадаўства Беларусі аб масавых мерапрыемствах», што пацягнула «нанясенне істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзян, арганізацый, дзяржаўным і грамадскім інтарэсам».

Пры гэтым, паводле інфармацыі міністэрства, у акцыі пратэсту бралі ўдзел прадстаўнікі некаторых грамадскіх арганізацый і палітычных партый. У прыватнасці, лідары АГП, ПКБ і Партыі БНФ. У сувязі з гэтым міністэрства запатрабавала ад кіруючых органаў згаданых партый у трохдзённы тэрмін накіраваць інфармацыю аб тым, ці былі «дадзеныя асобы ўпаўнаважаны партыямі на ўдзел у мерапрыемстве» і накіраваць адпаведныя рашэнні партый. У выпадку, калі лідары партый не былі надзелены адпаведнымі паўнамоцтвамі для ўдзелу ў акцыі, міністэрства патрабуе ад партый «выказаць афіцыйную пазіцыю адносна дзеянняў» лідараў на мерапрыемстве.

Міністэрства юстыцыі Беларусі таксама падала ў Вярхоўны суд іск аб ліквідацыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Перспектыва», кіраўнік якога браў удзел у акцыі.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Усе выдаткі — з арганізатараў акцыі

У Мінску ўсе выдаткі, якія панёс горад у выніку несанкцыянаванай акцыі пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў, павінны кампенсаваць арганізатары гэтага мерапрыемства. Аб гэтым заявіў старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў на аператыўнай нарадзе ў мэрыі.

Міхаіл Паўлаў назваў недапушчальнай сітуацыю, калі амаль дзве гадзіны быў паралізаваны рух на галоўнай сталічнай магістралі...

БЕЛТА.

Напярэдадні

Раўненне на баскетбалістак

Гандбалісты стартуюць на Еўра ў «групе смерці», але мараць палепшыць дасягненне беларусак у гульнявых відах спорту

Лепшае дасягненне ў гісторыі беларускіх гульнявых відаў спорту належыць нацыянальнай жаночай зборнай па баскетболе, якая на дэбютным для сябе Еўра-2007 выйграла «бронзу». І хоць мужчыны галантна прапусцілі наперад дам, яны ні ў якім разе не адмаўляюцца ад сваіх спартыўных амбіцый. Шанц паказаць сябе ва ўсёй красе на аналагічным турніры з'явіцца ў нашых гандбалістаў пачынаючы з гэтага тыдня: з 17 па 27 студзеня ў нарвежскім Бергене адбудзецца чэмпіянат Еўропы. Радасць ад таго, што беларускія гандбалісты прабіліся на топ-турнір пасля перапынку больш як у 10 гадоў, засмучае толькі той факт, што наша дружына апынулася ў самай складанай групе.

Спартак МІРАНОВІЧ і старшыня федэрацыі гандбола Уладзімір КАНАПЛЁЎ.

Як гандбалісты рыхтаваліся да сур'ёзных баталій, што патрэбна, каб выступіць «на ўра», напярэдадні старту кантынентальнага першынства расказаў галоўны трэнер каманды Спартак МІРАНОВІЧ.

— У абедзвюх сустрэчах з палякамі наша каманда ўступіла віцэ-чэмпіёнам свету палякам (27:35 і 31:34)...

— Гэта былі кантрольныя падрыхтоўчыя гульні. Трэба было нагуляць нашы звязкі, камбінацыі, увайсці ў добрую спартыўную форму. Мы не ставілі мэты замучыць першую сямёрку, каб яна гуляла ад пачатку матча да канца. Хацелася праверыць і другі эшалон, запасных гандбалістаў.

— Поспех жаночай зборнай па баскетболе на аналагічным турніры натхняе каманду на перамогі?

— Безумоўна. Прыклад нашых баскетбалістак паказвае, у якім накірунку патрэбна рухацца і нам. Мы таксама будзем змагацца. Усе ігракі хочуць паказаць сваё майстэрства на чэмпіянаце Еўропе. І ўсё ж, мы не скептыкі, але ведаем, што ў такой цяжкай групе, як наша, вышэй за галаву не скочыш. Нашы сапернікі — чэмпіёны свету, Еўропы, адны з наймацнейшых гандбольных камандаў. Тым не менш, жыццё пакажа, ці зручны гэта варыянт для нас. Вядома ж, мы рыхтаваліся, праглядвалі запісы гульняў немцаў, іспанцаў, венграў. Майстэрства і вопыту ім не займаць. Наша ж каманда едзе на чэмпіянат у першы раз пасля доўгай паўзы, але з гонарам і вялікай надзеяй на поспех.

— Што, па-вашаму, неабходна для ўдалага выступлення?

— Высакакласныя ігракі. Толькі тады мы зможам спаборнічаць на роўных з лепшымі зборнымі Еўропы, калі па хуткасна-сілавых якасцях і тэхніцы гульні наблізімся да іх. Пакуль жа ў нас маладая каманда. Спадзяюся, што ў гэтых гандбалістаў перамогі яшчэ наперадзе.

— Лідары нашай зборнай — легіянеры. Вы лічыце, што толькі ў замежных чэмпіянатах можна палепшыць узровень гульні?

— Калі ўсіх моцных ігракоў мы адправім за мяжу, то маладыя гандбалісты не змогуць расці ў класе і знізіцца ўзровень нашага чэмпіянату. Возьмем, напрыклад, першынство Германіі: у ім выступаюць усе моцныя нямецкія гандбалісты, таму там любая клубная каманда мацней за любую зборную. Я вельмі хацеў бы, каб кіраўніцтва нашай федэрацыі зацікавіла нашых ігракоў, забяспечыла іх на такім жа высокім узроўні, як за мяжой, каб яны засталіся ў Беларусі. З той жа Расіі ўжо гадоў 5—10 ніхто з ігракоў не з'язжае.

— Для стварэння добрай атмасферы хакейную зборную вадзілі ў цырк, каб яны паспрабавалі сябе ў ролі клоунаў, жанглёраў і паветраных акрабатаў, для футбалістаў ладзілі сямейныя вячэры і хадзілі з імі ў царкву... Як вы ставіцеся да такіх метадаў яднання каманды, ці выкарыстоўваеце іх самі?

— Павячэраць, безумоўна, добра *(усміхаецца)*. Памятаю, як перад Алімпіядай у Сеуле зборная СССР хадзіла на падводную лодку ва Уладзівастоку і давала клятву выйграць. Тоесьці ставіць свечкі ў царкве. Калі толькі гэта дапамагала б перамагчы, мы б адтуль не вылазілі. У любым выпадку мы павінны разлічваць толькі на сябе.

— Дзякуй за гутарку! Удачы вашым падначаленым у Нарвегіі!

Ірына ПРЫМАК.

Хозяйственный суд Могилевской области

28 января 2008 года в 14.00 путем проведения повторных публичных торгов с понижением стоимости на 20 % продает арестованное имущество РУПП «Могилевхлебпром», расположенного по адресу: г. Могилев, ул. Левая Дубравенка, 28 (центр города). Стоимость объекта после уценки 1.185.971.248 руб. с НДС:

Наименование объекта оценки	Рыночная стоимость, руб. (с НДС)
Здание столярного цеха с пристройкой, общей площадью 349 кв. м, строительным объемом 1354 куб. м, площадью застройки 404 кв. м. Год постройки 1956.	103.390.656 руб.
Здание котельной с пристройками и погребом, общей площадью 389,6 кв. м, строительным объемом 1783 куб. м, площадью застройки 468 кв. м. Год постройки 1952.	102.210.656 руб.
Здание макаронного цеха с пристройками, общей площадью 964 кв. м, строительным объемом 5071 куб. м, площадью застройки 709 кв. м. Год постройки 1949.	220.944.144 руб.
Здание склада, общей площадью 283,3 кв. м, строительным объемом 1398 куб. м, площадью застройки 343 кв. м. Год постройки 1958.	73.598.016 руб.
Здание душевой, общей площадью 96,6 кв. м, строительным объемом 562 куб. м, площадью застройки 134 кв. м. Год постройки 1958.	29.744.944 руб.
Здание административно-бытового корпуса с пристройками, общей площадью 554,7 кв. м, строительным объемом 2395 куб. м, площадью застройки 523 кв. м. Год постройки 1947.	388.880.800 руб.
Здание проходной, общей площадью 42 кв. м, строительным объемом 176 куб. м, площадью застройки 60 кв. м. Год постройки 1947.	5.040.016 руб.
Здание склада, общей площадью 190,7 кв. м, строительным объемом 661 куб. м, площадью застройки 213 кв. м. Год постройки 1960.	55.624.256 руб.
Здание мастерских с пристройкой, общей площадью 66 кв. м, строительным объемом 269 куб. м, площадью застройки 93 кв. м. Сарай, площадью застройки 34,3 кв. м. Год постройки 1945.	16.248.128 руб.
Здание плодово-перерабатывающего цеха с пристройкой (уборная), общей площадью 115,6 кв. м, строительным объемом 570 куб. м, площадью застройки 142 кв. м. Год постройки 1956.	16.836.240 руб.
Асфальтобетонное мощение, площадью 3517 кв. м, забор кирпичный, площадью 141,1 кв. м.	173.453.392 руб.

Лицо, желающее принять участие в торгах, обязано дать подписку о том, что нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества, и внести на депозитный счет хозяйственного суда № 3642910890659 в филиале 700 ОУ АСБ «Беларусбанк», г. Могилева, код 536, УНП 700233927, сумму в размере 10 процентов оценки стоимости продаваемого имущества. Сумма, внесенная лицом, купившим имущество с торгов, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов предварительно внесенные ими суммы возвращаются после окончания торгов, если иное не установлено законодательством.

Шаг торгов устанавливается в размере 5 % — 59.298.562 руб.

Торги состоятся в хозяйственном суде Могилевской области (г. Могилев, ул. Первомайская, 85, к. 242). За справками обращаться по тел. 327052.

УНП 700233927

Хозяйственный суд Могилевской области

28 января 2008 года в 10.30 путем проведения публичных торгов продает арестованное имущество ОДО «Тетраком», расположенного по адресу: г. Быхов, ул. Железнодорожная, 15. Стоимость объекта 131.452.000 руб. с НДС:

Наименование объекта оценки	Рыночная стоимость, руб. (с НДС)
Здание арочника (в1/к), общая площадь склада 911,84 кв. м, площадь застройки 973,44 кв. м, объем здания 7476 куб. м, год постройки 2002. Крыша металлическая, стены кирпичные.	131.452.000 руб.

Лицо, желающее принять участие в торгах, обязано дать подписку о том, что нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества, и внести на депозитный счет хозяйственного суда № 3642910890659 в филиале 700 ОУ АСБ «Беларусбанк», г. Могилева, код 536, УНП 700233927, сумму в размере 10 процентов оценки стоимости продаваемого имущества. Сумма, внесенная лицом, купившим имущество с торгов, зачисляется в счет покуп

Экслібрыс «Звязды»

...Урок любові да Айчыны, малой і вялікай

У пошуках страчанага: гісторыя Беларусі ў старых паштоўках/ аўтар тэксту А.М. Карлюкевіч; паштоўкі У.А. Ліхадзедава. — Мінск: Литература и Искусство, 2007. — 239 с.: іл.



Падсумоўваннем шырокай працы філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава, паштоўкі з калекцыі якога некалькі гадоў запар друкуюцца ў газеце «Советская Белоруссия» штотыдзень, стала выданне кнігі «У пошуках страчанага: гісторыя Беларусі ў старых паштоўках». Прыгожа, па-мастацку аформленая кніга — гэта сапраўды фатаграфічны альбом, які вядзе чытача і гледача ў падарожжа па гарадах, мястэчках, вёсках Беларусі. Шаснаццаць раздзелаў кнігі — шаснаццаць адмысловых экскурсій. Па Брэсце і Брэстчыне, па Віцебску і Віцебшчыне, па Гомелі і Гомельшчыне, па Гродне і Гродзеншчыне, па Мінску і Міншчыне, па вуліцах і плошчах гарадоў, па даўніх кірмашах і дарогах, якія адорваюць многімі і многімі адкрыццямі. Асобна вылучаны філакартычныя скарбы, прысвечаныя Пінску, Полацку, Навагрудку. Завяршае кнігу раздзел «Беларускія вобразы», дзе разам сабраны паштоўкі, што знаёмяць з партрэтамі нашых прашчураў з самых розных куточкаў Беларусі.

Ва ўступным слове «Да чытача» заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Павел Якубовіч заўважае: «Перад вамі ўнікальная кніга, якая дазволіць вам здзейсніць падарожжа ў часе. Пагартайце старонкі яе і вы ўбачыце сівыя замкі і мураваныя храмы, вузенькія вуліцы і вытаптаныя сцяжынкі, запыленыя гарады і жывапісныя мястэчкі. Вы наяве ўбачыце людзей, якіх ужо няма, але якія жылі ў Беларусі і дзякуючы гэтай кнізе сталі вашымі сучаснікамі.

Гэтая кніга ілюстравана вельмі рэдкімі фатаграфіямі і паштоўкамі, якія сабраў дзіўны чалавек, Уладзімір Ліхадзедаў. Кароткія каментарыі належаць пяру пісьменніка Алеся Карлюкевіча. Іх сумесная праца — цыкл публікацый пад рубрыкай «У пошуках страчанага» на старонках «СБ. Беларусь сегодня» — ужо адзначана прэміяй «За духоўнае адраджэнне». Упэўнены, што і гэтая кніга таксама атрымае прэмію — прызнанне чытачоў, людзей, для якіх дорага ўсё, што звязана з Беларуссю».

Усяго на старонках выдання змешчана 340 паштовак. Поруч з гарадамі Беларусі прадстаўлены выявы невялікіх паселішчаў нашай Айчыны — Дамачова, Крывошына, Манькавіч, Моўчадзі, Сталовіч, Хомска, Дзісны, Друі, Лынтуп, Заспы, пінскага і акцябрскага Парэччаў... Уважлівае «прачытанне» фатаграфічнага матэрыялу вядзе да многіх разваг, прымушае адкрыць старонкі іншых выданняў, грунтоўных энцыклапедый і даведнікаў, каб далей павесці знаёмства з аднойчы адкрытымі паселішчамі.

Напрыканцы ёмістага фаліянта «У пошуках страчанага» (дарэчы, кніга тыражом у 3000 экзэмпляраў якасна, бездакорна аддрукавана на Мінскай фабрыцы каляровага друку) са слоўцам «Павучальнае падарожжа ў часе і прасторы» выступае лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь прафесар Адам Мальдзіс. Вось што ён, у прыватнасці, піша: «Матэрыялы кнігі, з якімі вы пазнаёміліся, маюць для нашага грамадства, нашай дзяржавы, такой маладой і адначасова такой сталай, з тысячагадовай, багатай, але далёка не да канца спазнанай гісторыяй, вялікае павучальна-пазнаваўчае і выхаваўчае значэнне. Павучальнае — таму што вучаць павазе да продкаў, да гістарычных традыцый. Пазнаваўчае — таму што дазваляюць нам шырэй глянуць на мінулае: не ўсё ў ім было такое дрэннае, як нам часам у працэсе самасцвярджэння здаецца; і раней узводзіліся будынкі, якія мелі і маюць эстэтычную каштоўнасць. Іншая справа, што войны і наша нядбайнасць прывялі да разбурэння многіх помнікаў архітэктуры. А выхаваўчае — таму, што вучаць нас любові да айчыны, малой і вялікай».

Да гэтых слоў, відаць, хіба што варта дадаць наступнае: праект «У пошуках страчанага» павінен мець працяг. Калекцыя Уладзіміра Ліхадзедава налічвае каля 15 тысяч старых паштовак. І, несумненна, кожная з іх — добры памагаты ў вандроўках па краіне Беларусь.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Выставы

МОЖАМ ДАЛУЧЫЦЦА ДА ТОЙ ЭПОХІ, ЯКОЙ УЖО НЯМА

У музеі-галерэі «Свет фота», што на вуліцы Прытыцкага, 10, адкрылася ўнікальная выстава каляровых работ фотамастака, вучонага-хіміка, выдаўца Сяргея Міхайлавіча Пракудзіна-Горскага (1863—1943).

У 1909 годзе Сяргей Міхайлавіч пачаў ажыццяўляць сваю запаветную мару: паказаць у каляровым адлюстраванні ўсю Расійскую імперыю з яе шматлікімі народамі, гарадамі і сёламі, помнікамі архітэктуры, паказаць быт, традыцыі і культуру гэтых народаў. Ён шмат вандруе і фатаграфуе тагачасную Прыбалтыку, Украіну, Беларусь, Паволжа, Паўночную частку Расіі, Сярэднюю Азію...

Каляровай фатаграфіі тады яшчэ не існавала. Таленавіты майстра распрацаваў сваю методыку атрымання каляровых здымкаў. Гэтыя здымкі — адзінае, найкаштоўнейшае, эмацыянальнае і пазнавальнае сведчанне ў колеры аб Расіі таго часу.

Багатая калекцыя шкляных негатываў цудам апынулася і захавалася ў Бібліятэцы кангрэса ЗША.

У свеце не існуе падобных калекцый па колькасці фатаздымкаў, а іх больш за 2700 па тэматычным і тэрытарыяльным ахопе, што адносяцца да пачатку XX стагоддзя.

Выдавецтва Беларускай Праваслаўнай Царквы (галоўны рэдактар Ігар Віркоўскі і аўтар ідэі і праекта Аляксандр Вейнік), вырашыла прадставіць шырокаму гледачу ўнікальную калекцыю. Каб ажыццявіць ідэю, спатрэбілася стварэнне спецыяльнага праграмнага забеспячэння. Неверагодна доўгі час — некалькі месяцаў перакачвалі выявы з бібліятэкі кангрэса ЗША на спецыяльна створаны сайт, праводзілася вялікая даследчая праца па ідэнтыфікацыі сфатаграфаваных аб'ектаў. Усе каляровыя здымкі Пракудзіна-Горскага такім чынам адноўлены. Выйшаў у свет першы з задуманай серыі фотаальбом гэтых здымкаў «Расійская імперыя ў колеры (1909—1915)» у выдавецтве Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Дзякуючы апантаным людзям мы можам паглядзець, адчуць, эмоцыямі далучыцца да той эпохі, якой ужо няма.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.

Разам з птушкамі

ЧАРОДЫ ХВОЙНАГА ЛЕСУ

Зімою птушак у лясах сустракаецца значна менш, і лётаюць яны галоўным чынам не вельмі маленькімі групоўкамі. Чародны спосаб жыцця ўзімку дапамагае невялікім птушкам выжыць у халодныя часы. Сёння мы працягваем знаёміць нашых чытачоў са светам птушак разам са спецыялістам па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Русланам Шайкіным.

Чаму зімой розныя па біятонах птушкі пачынаюць аб'ядноўвацца ў дружную сям'ю? У такіх чародах птушкі могуць больш хутка выявіць драпежнікаў. Як толькі адна птушка «часовай сям'і» заўважыць небяспечны аб'ект, то адразу паведаміць аб гэтым сваім крылатым сябрам. Асобныя віды птушак у чародзе застаюцца на сумесную начоўку ў нішах пад карчажынамі, густымі яловымі лапкамі і карэннем дрэў. Птушкі знаходзяць затоенае «памяшканне», збіраюцца там шчыльнай групоўкай і спяць уначы грэючы адна адну. Менавіта ў доўгія і халодныя зімовыя ночы «загартоўваецца» касцяк сумесных чарод.

Такім чынам, пачуўшы ў зімовым лесе голас адной птушкі, можна адшукаць побач вялікую чараду. У хваёвых лясах чародкі складаюцца з розных відаў крылатых. У такія групоўкі аб'ядноўваюцца розныя віды сініц, а таксама самая маленькая птушачка еўрапейскага кантынента — жоўтагаловы каралёк.

Гэтая крылатая малеча выключна насякомаедная, таму проста неверагодна, як яна зімой адшуквае вялікую колькасць сонных насякомых і іх кукалак, каб як след падхарчавацца і перажыць халады. Каралёк — вельмі актыўная і вёрткая птушка. Прыродныя «сталоўкі» спрытнай малечы знаходзяцца ў верхніх кропках хвойных дрэў, дзе птушка па-майстэрску абследуе яловыя лапкі і масава здзёўбвае коканы сонных насякомых. Абмен рэчывам у целе каралькоў адбываецца вельмі хутка, таму адшукаць і з'есці трэба шмат лясных шкоднікаў, аб'ём жа сутачнага рацыёну птушкі можа заважыць больш за яе саму.

Побач з каралькамі ў хваёвых лясах можна сустрэць розныя віды сініц, якія не заўсёды наведваюць жыллё чалавека. Гэта тыповыя жыхары хвойнікаў — сініца-маскоўка, а таксама вельмі прыгожая птушачка — хахлатая сініца, якую ў Беларусі яшчэ завуць грэнадзёркай. Сініцы — насякомаедныя птушкі, але зімой з задавальненнем харчуюцца розным дробным зернем і насеннем, у тым ліку насеннем ялін. У змешаных лясах сініцы не заўсёды аб'ядноўваюцца з каралькамі. Толькі ў хвойніках сустракаюцца разнастайныя па відавым складзе і вялікія па колькасці чароды.

Большасць насякомаедных беларускіх птушак восенню мігруруюць у цёплыя краіны. Зімаваць застаюцца толькі самыя жвавыя птушкі-«патрыёты». Менавіта жоўтагаловы каралёк з'яўляецца аселым і звычайным відам беларускіх лясоў, якіх у нашай краіне налічваецца каля 300—350 тысяч пар. Сустракаецца ён па ўсёй тэрыторыі Беларусі ў сасновых, яловых і часткова змешаных лясах.

Памеры каралька сапраўды ўражваюць: даўжыня цела — 12 сантыметраў, а размах крылаў — 13,5. Аднак галоўнае, што важыць жоўтагаловы лятун не больш як 5—7 грамаў! Як гэта можа быць? На маё здзіўленае эмацыянальнае пытанне спадар Шайкін адзначыў, што яму пашанцавала ўжывую ўбачыць трохдзённае птушаня каралька. Гэты маленькі цуд быў памерам з чмяля, але меншы за мезінец. «Размаўляюць» дарослыя каралькі вельмі тоненькім і цікім свісцячым гукам, маюць непрыкметную і спакойную песню, якая складаецца толькі з некалькіх «радкоў».

Жывуць каралькі не толькі ў лясах, але і на тэрыторыі ўсіх гарадскіх паркаў краіны, калі там сустракаюцца іглічныя дрэвы. У Мінску жоўтагаловага каралька можна пачуць і (калі пашанцуе) убачыць у хваёвых парках на ўсёй тэрыторыі мегаполіса. Сустрэць маленькага і нястомнага санітара можна нават у Лошыцкім парку, дзе ёсць толькі невялікая яловая алея.

Сяргей КУРКАЧ.

Звычайны паўзунок.

Жоўтагаловы каралёк.

Фестывалі

Жывы цуд Шапэна і Орды

Юбілейны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары» парадаваў адкрыццямі. Упершыню на фэсце прагучала музыка Напалеона Орды. Віртуознае выкананне яе народным артыстам Беларусі Ігарам Алоўнікавым яшчэ раз напоўніла сэрцы прысутных гонарам за тое, што мы з'яўляемся землякамі знакамітага мастака і геніяльнага кампазітара. Ганарыцца можна і тым, што другога такога фестывалю няма ў краіне. Пра апошняе сказаў міністр культуры Уладзімір Мацвяйчук падчас адкрыцця.

Сімфанічны аркестр «Маладая Беларусь» Беларускай акадэміі музыкі ў першы вечар літаральна зачараваў залу штраўсаўскімі вальсамі і полькамі. Калектыў пад кіраўніцтвам Міхаіла Казінца вяртаўся з гастроляў па Германіі і зрабіў прыпынак у Брэсце, трапіў, што называецца, з карабля на баль «студзеньскіх вечароў». А балем фэст зрабіла класічная музыка. Апісаць музыку, вядома, немагчыма, хіба што паэтычным радком. Лепей не скажаш, як паўвека назад сказаў Пастэрнак: «Як некалі Шапэн уклаў жывы цуд фальваркаў, паркаў, гаёў, магіл у свае эцюды». Гэтым жывым цудам і наталялі душы слухачоў музыканты і выканаўцы чатыры фестывальныя дні.

З задавальненнем прымала публіка скрыпача з Кішынёва Дзмітрыя Пачтара, з не меншай радасцю слухалі кітайскага тэнара Вань Я Хуаня. Вядомая песенька герцага з оперы Вэрдзі «Рыгалета» ў выкананні 25-гадовага лаўрэата многіх конкурсаў выклікала шквал авацый. Яго зямлячка піяністка Ван Лі іграла Фрэдэрыка Шапэна. Ван прыехала да нас другі год запар. І хоць паміж фестывалямі ў Ван нарадзілася дачка, гэта не стала перашкодай для вялікай дарогі. Васьмімесячную дачушку лаўрэат шматлікіх міжнародных конкурсаў узяла з сабой.

Як праспявала пра сябе Людміла Лядава, яна «заўжды ў страі». Кампазітар, піяністка, спявачка зачаравала сваім аптымізмам і маладым запалам. Яе раманс «Не бойцеся болі ад любові» стаў літаральна заклікам любіць жыццё. Ну хто паверыў бы, гледзячы на спявачку, што нарадзілася яна ў сярэдзіне 20-х!

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Кінакрокі

Час, які трэба асэнсаваць

Сумесны расійска-беларускі фільм «Вока за вока», пра які многа гаварылі і якога даўно чакалі, зняты, цяпер ён пойдзе да гледача. Новая мастацкая стужка была прадстаўлена на «Беларусьфільме» літаральна напярэдадні Новага года. Але гучную прэзентацыю ў Беларусі гэтага сумеснага праекта здымачная група наладзіла адразу ж, як толькі пачаліся здымкі. Рэжысёр Генадзь Палока распавядаў пра тое, чаму ён звярнуўся да падзей рэвалюцыі і грамадзянскай вайны: яны, можа, і не перавярнулі свет зусім і назаўсёды, але дакладна змянілі людзей.

«Магчыма, у Беларусі сёння адна з нямногіх студый на постсавецкай прасторы, дзе захаваўся высокі ўзровень тэхнічнага складу. Такую групу, якую мне ўдалося сабраць у Беларусі, я нідзе не сабраў бы, — дзяліўся ўражаннямі падчас працы Генадзь Палока. — У нашай карціне грандыёзныя дэкарацыі: трэба ж было аднавіць атмасферу 1918-га года, таго часу, калі пачаўся «чырвоны тэрор», калі вялізныя палацавыя комплексы былі запоўнены закладнікамі. Мы пакутліва, але якасна будавалі дэкарацыі. Карціна складаная. Мы не здымалі хутка, таму што былі расійскія артысты, якія спецыяльна прыязджалі на здымкі, але большая частка групы — беларуская. Праца ішла не проста. Але часам неспадзявана мы знаходзілі аднадумцаў, людзей, якія былі гатовыя нам аказаць любую дапамогу, ад якіх мы яе нават не чакалі. Проста яны шчыра хацелі, каб гэты расійска-беларускі праект адбыўся. Тут жыве цудоўны народ, тут ёсць цудоўныя кінематаграфісты, выдатныя людзі».

Трэба адзначыць, што ў Беларусі гэты расійскі рэжысёр працаваў не ўпершыню. Увогуле, Генадзь Палока добра вядомы гледачу па фільмах «Рэспубліка «Шкід», «Вяртанне Браняносца», «Інтэрвенцыя» і іншых. Фільм «Вока за вока» стаў экранізацыяй аповесці Барыса Лаўранёва «Сёмы спадарожнік». Карціна стваралася сумесна «Беларусьфільмам» і расійскай кінакампаніяй «Пакроўскія вароты». Але цікавы склад беларускіх удзельнікаў працы над фільмам. Аператарам-пастаноўшчыкам была Таццяна Логінава, вядомы беларускі кінааператар, адну з галоўных роляў выканаў Уладзімір Гасцюхін. Але акрамя яго бліснулі Расціслаў Янкоўскі, Генадзь Гарбук, Аляксандр Кашпераў і Алеся Пухавая. Засталося пабачыць іх у справе — на свае вочы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Інфарм-укол

ХАДА ЯК ДЫЯГНАЗ

Звярніце ўвагу на сваю хаду. Яна залежыць ад стану пазваночніка, які ў сваю чаргу адказвае за работу ўсіх нашых унутраных органаў.

Калі вы сутуліцеся, плечы як быццам злёгку сагнутыя наперад, магчыма, вам трэба праверыць работу страўніка. Тым, хто ходзіць асцярожна, уласцівы праблемы з ціскам. Хутчэй за ўсё, у такіх людзей бываюць галавакружэнні. Калі чалавек стаіць або сядзіць, пры гэтым часта мяняе позу — гэта прыкметы астэахандрозу або міжпазванковай грыжы. Калі вы ідзяце як быццам на пратэзах, імкняцеся як мага менш згінаць ногі ў каленях, пры гэтым робіце дробныя крокі, праверце суставы. Такая хада — прыкмета артрозу ці артрыту. Артроз тазасцегнавога сустава, або коксартроз, пачынаецца менавіта з адчування дыскамфорту пры хадзе. Шырока расстаўляюць ногі пры хадзе, як правіла, людзі, якія пакутуюць ад гемарою.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Афіша

ЯК СУСТРЭЛІ, ТАК І ПАВІНШУЮЦЬ

27 студзеня 2008 года гурт «Звяры» дасць у Мінску вялікі сольны канцэрт пад дэвізам «Усё толькі пачынаецца». Хоць выступленне гэта далёка не першае — паводле падлікаў саліста калектыву Рамана Білыка, прыкладна шостае. Чым, спытаеце, так палюбілася «Звярам» беларуская сталіца? Адказ вельмі просты: Мінск стаў чатыры гады таму першым горадам, з якога пачаўся гастрольны адлік гурта. І зараз калектыў прыязджае ўжо не толькі і не столькі выступіць перад вялікай аўдыторыяй, колькі завітаць у госці да добрых сяброў і знаёмых.

На гэты раз, зрэшты, у гастрольнага візіту будзе свая «фішка». Працягваючы і падтрымліваючы святочны навагодні настрой, музыканты абвясцілі вялікі конкурс. Задача пастаўлена не надта і складаная: трэба толькі знайсці забаўныя фатаздымкі ці відэаролікі са святкавання Новага 2008 года і даслаць лепшае з выбранага да 20 студзеня на электронную пошту: concurs@zve.ru.

Лепшыя работы будуць змешчаны на афіцыйным сайце гурта — а ў выпадку, калі ў лідары трапіць работа з Беларусі і яе аўтар прыйдзе на канцэрт — саліст «Звяроў» асабіста павіншуе гэтага чалавека і нават уручыць адмысловы прыз... Які? Вось непасрэдна на канцэрце і пабачым. Пачатак канцэрта — а 19-ай гадзіне. Кошт білетаў — ад 20 да 60 тысяч рублёў, танцпляцоўка — 35 тысяч. Танчаць — усе, хто пажадае!

ДЗЯЦІНСТВА З КРЫШКАЙ

Напярэдадні старога Новага года, 13 студзеня, у досыць камернай і ўтульнай атмасферы сталічнага клуба «Гудвін» даў свой сольны канцэрт «Дзяцінству крышка» фрык-кабарэ-бэнд «Сярэбранае вяселле».

Меламаны ўжо даволі добра ведаюць гэты калектыў. Для тых жа, каму назва ўсё ж нічога не гаворыць — толькі некалькі яскравых фактаў з біяграфіі «Сярэбранага вяселля». Салістка гурта «Бенька» (Святлана Бень) — рэжысёр Тэатра лялек. Таму і кожнае выступленне гурта — нездарма ён прадстаўлены як «фрык-кабарэ бэнд» — ператвараецца ў маленькую пастаноўку, напоўненую дзівацтвамі, крыху тэатральнай эксцэнтрыкай і рэплікамі вулічнага балагана, лялькамі і трукамі. Прычым усё гэта на французскай мове (у Святланы французскія карані) і ў стылі класічнага французскага шансону. Дарэчы, летась гурт даў серыю канцэртаў у Францыі — ад Нанта да Парыжа, ад знакамітага Манмартра да Эйфелевай вежы. Вышэй, як кажуць, толькі зоркі. Нездарма ж гурт прызнаны адной з самых яскравых падзей леташняга музычнага жыцця Беларусі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.20	16.17	7.57
Віцебск —	8.16	16.01	7.45
Магілёў —	8.11	16.07	7.56
Гомель —	8.00	16.11	8.11
Гродна —	8.34	16.34	8.00
Брэст —	8.27	16.42	8.15

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Серафіма, Сільвестра;*
К. *Арнольда, Ізыдара, Макара, Паўла.*

НАДВОР'Е на заўтра



— слабая геамагнітная бура
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 сак. | 5 сак. | 8 сак. | 11 сак. | 14 сак. | 17 сак. | 20 сак. | 23 сак.

...у суседзяў

ВАРШАВА	+3..+5°С	КІЕЎ	0..+2°С	РЫГА	+1..+3°С
ВІЛЬНЮС	0..+2°С	МАСКВА	-2..0°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+1..+3°С

Дзве даты

15 студзеня

1908 год — 100 гадоў таму ў вёсцы Маўчаны цяперашняга Сенненскага раёна нарадзіўся Заір Ісакавіч Азгур, вядомы беларускі скульптар, народны мастак Беларусі і СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Працаваў у галіне станкавай і манументальнай скульптуры. Аўтар помніка Я. Коласу ў Мінску, помнікаў-бюстаў Я. Купалу, Ф. Дзяржынскаму, двойчы Герою Савецкага Саюза С. Грыцаўцу і інш.

1903 год — нарадзіўся Ігар Курчатаў, выдатны савецкі фізік, стваральнік савецкай атамнай бомбы.

Цытата дня:

«Мала мець добрыя мазгі, галоўнае — умець правільна і своечасова імі скарыстацца».

Рэнэ Дэкарт (1596—1650), французскі філосаф, матэматык, фізік.

Манета, прысвечаная Мастаку...

Першымі памятнымі манетамі, якія ў гэтым годзе выпусціў у абарачэнне Нацыянальны банк Беларусі, сталі манеты «З. Азгур. 100 гадоў», паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Сярэбраная манета мае намінал 10 рублёў, пробу сплаву 925 і масу 16,81 грама. Медна-нікелевая выпушчана намаленым 1 рубель і масай 13,16 грама. Тыраж абедзвюх манет — па 3000 штук кожная. Сярэбраная манета адчаканена якасцю «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк».

Ігар ГРЫШЫН.

Усміхнёмся!

Народная мудрасць: чым больш у вас сяброў і сваякоў, тым больш непатрэбных рэчаў з'яўляецца ў вас пасля Новага года.

☺

— Зімовай рыбалкай захапляецеся?
— Чаму ты так вырашыў?
— А твар чырвоны...

☺

Камп'ютарнае.
Вірусы, вірусы... Прыбіральшчыца — вось сіла! Адзін удар швабрай па серверы, і паўканторы без працы ўжо гадзіну.

☺

Маладая сям'я адзначае Новы год з гасцямі. Адзін з іх задае пытанне:
— А хто ў вас дома гаспадар?
Жонка:
— Гаспадар, падай голас!
Муж (жаласліва):
— Гаў...

☺

Вовачка прыходзіць дадому са школы:
— Тата, там у нас у школе такое здарылася, што тваёй зарплаты не хопіць!

Віншуем з днём нараджэння любую жонку, матулю і бабулю ***Кацярыну Іосіфаўну РАГАЦЭВІЧ.***

Няхай твой твар ніколі не пакідае ўсмешка, душа і сэрца няхай заўсёды застаюцца маладымі. Ты для нас — самы родны і патрэбны чалавек, самая лепшая ў свеце.

Муж, дзеці, унукі, в. Вострауў.

Таісе Паўлаўне ЦВІРКА *з в. Залужжа на Стаўбцоўшчыне з нагоды юбілею шчырыя пажаданні здароўя, радасці і поспехаў у справах.*

Марыя, Дзмітрый Станкевічы.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.419. Індэкс 63850. Зак. № 217. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12